Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЛЮТАГА 2007 г.
АЎТОРАК
№ 34 (25899)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прэзідэнт Беларусі адобрыў прапанаваныя меры па дасягненню ў 2007 годзе дадатнага знешнегандлёвага балансу

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў прапанаваныя ўрадам і Нацыянальным банкам меры па дасягненню ў 2007 годзе дадатнага сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі. Аб гэтым ішла размова 19 лютага на справаздачы кіраўніку дзяржавы прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага і старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча.

У 2006 годзе сальда знешнеэканамічнай дзейнасці краіны было адмоўнае. Аляксандр Лукашэнка жорстка запытаў за невыкананне яго даручэння і запатрабаваў, каб сёлета гэты важнейшы паказчык быў выкананы ў аб'ёме не менш як $500 млн. У мэтах дасягнення дадатнага знешнегандлёвага балансу ўрадам Беларусі і Нацыянальным банкам распрацавана сумесная праграма мераў, якая была падтрымана кіраўніком дзяржавы. У праграме, у прыватнасці, прадугледжана, што кожнае прадпрыемства павінна праводзіць эфектыўную знешнеэканамічную палітыку. У адпаведнасці з паказчыкамі развіцця Беларусі на гэты год тэмпы прыросту экспарту павінны перавышаць тэмпы прыросту імпарту не менш як на 5 працэнтных пунктаў. Гэта будзе галоўным вынікам работы прадпрыемстваў, міністэрстваў і ведамстваў краіны. Урад і Нацыянальны банк будуць кантраляваць выкананне пастаўленых задач.

У той жа час яны маюць намер усяляк садзейнічаць развіццю экспарту беларускіх тавараў, стварэнню тавараправаднай сеткі, адкрыццю новых рынкаў збыту, вырашэнню пытанняў па выкананню праграмы імпартазамяшчэння. Распрацаваная праграма мераў уключае комплекс задач, выкананне якіх дасць магчымасць забяспечыць выхад на дадатнае сальда знешняга гандлю Беларусі таварамі і паслугамі. Пачынаючы з гэтага года, гэты паказчык уваходзіць у лік важнейшых паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, растлумачылі ў прэс-службе Прэзідэнта.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Камітэт дзяржкантролю Беларусі ўзмоцніць работу па выяўленню лжэпрадпрымальніцкіх структур

Аб гэтым далажыў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыня КДК Зянон Ломаць.

Зянон Ломаць расказаў аб выніках работы Камітэта дзяржкантролю за 2006 год. У прыватнасці, у мінулым годзе КДК было праведзена 12,9 тыс. праверак, у бюджэт дзяржавы паступіла Br319 млрд. У час даклада былі абазначаны асноўныя напрамкі дзейнасці камітэта на 2007 год. Прэзідэнт чарговы раз падкрэсліў, што ў рабоце КДК пры правядзенні праверак, перш за ўсё, трэба кіравацца прынцыпам справядлівасці. Паводле слоў Зянона Ломаця, у бягучым годзе камітэт мае намер і ў далейшым праводзіць узмоцненыя праверкі выканання дзяржпраграм, у першую чаргу праграмы па імпартазамяшчэнню. Асаблівая ўвага будзе надавацца кантролю за эфектыўным выкарыстаннем бюджэтных сродкаў.

У першым паўгоддзі запланавана таксама правесці комплексныя праверкі кожнай вобласці рэспублікі. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу, каб звесткі, атрыманыя ў выніку гэтых праверак, былі даведзены да кіраўніцтва ўсіх рэгіёнаў. Прэзідэнт адобрыў правядзенне праверкі выкарыстання бюджэтных сродкаў у Міністэрстве ўнутраных спраў. Цяпер вядзецца аналагічная праверка Міністэрства абароны.

Акрамя таго, Зянон Ломаць як сустаршыня беларуска-кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб выніках сваёй нядаўняй паездкі ў Кітай.

БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 85-годдзем Героя Беларусі, народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 лютага павіншаваў з 85-годдзем кіраўніка Творчых акадэмічных майстэрань жывапісу, графікі і скульптуры, Героя Беларусі, народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага.

Фота БЕЛТА.

У віншаванні адзначаецца, што творы Міхаіла Савіцкага, прасякнутыя сапраўдным гуманізмам, любоўю да Радзімы, пакланенем перад мужнасцю і стойкасцю беларускага народа, прымножылі скарбніцу нацыянальнай і сусветнай культуры.

«Мы высока цэнім Вас як чалавека вялікай, неўтаймаванай душы, які гарыць, а не тлее, сумленна і бескампрамісна адстойвае свае прынцыпы і ідэалы, прысвячае ўсяго сябе служэнню Айчыне», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Міхаілу Савіцкаму здароўя, жыццёвага і творчага даўгалецця, невычэрпнага натхнення, бадзёрасці і аптымізму.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь — Судан

Беларусь і Судан маюць агульныя падыходы па ўсіх найбольш важных міжнародных пытаннях, якія хвалююць абедзве дзяржавы. І ў будучым краіны маюць намер падтрымліваць адна адну на ўзроўні парламентаў ва ўсіх міжнародных арганізацыях, з якімі супрацоўнічаюць. Аб гэтым заявіў, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Канаплёў.

Ён паведаміў, што дамоўленасць аб узаемнай падтрымцы была дасягнута ў ходзе яго сустрэчы са старшынёй Нацыянальнай асамблеі Рэспублікі Судан Ахмедам Ібрахімам Эль-Тахірам.

Беларусь разлічвае на развіццё ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Суданам. Аб гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Генадзь Навіцкі, прымаючы кіраўніка Нацыянальнай асамблеі Судана Ахмеда Ібрахіма Эль-Тахіра, які знаходзіцца з візітам у Мінску. Ахмед Ібрахім Эль-Тахір запрасіў беларускіх парламентарыяў наведаць Судан з візітам у адказ.

Да 125-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа

Пытанні падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, абмеркаваны на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта ў Савеце Міністраў пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Косінца. Мерапрыемствы, прысвечаныя юбілейным датам беларускіх класікаў, зацверджаны Указам Прэзідэнта ад 29 студзеня 2007 года № 57, пройдуць па ўсёй рэспубліцы. Цэнтральным месцам правядзення стануць Маладзечанскі, Стаўбцоўскі раёны, горад Мінск.

БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЦЯКАЙ ЗІМА!

У мінулую суботу святкавалі Масленіцу і жыхары Карэліцкага раёна. На стадыёне райцэнтра была арганізавана канцэртна-спартыўная праграма з мноствам забаў і гульняў.

ПАСТКАЙ СТАЛА БАТАРЭЯ АЦЯПЛЕННЯ

Супрацоўнікі Наваполацкага гарадскога аддзела па НС выратавалі 12-гадовую дзяўчынку, якая трапіла ў пастку батарэі ацяплення. У адсутнасць бацькоў, якія паехалі ў камандзіроўку, дзяўчынка па неасцярожнасці засунула нагу паміж секцыямі чыгуннай батарэі ацяплення і не змагла дастаць. На шчасце, разам з ёй знаходзіўся 13-гадовы брат, які і выклікаў «хуткую дапамогу». Пасля агляду пацярпелага дзіцяці медыцынскія работнікі прыйшлі да высновы, што без дапамогі выратавальнікаў не абысціся. На момант прыбыцця супрацоўнікаў Наваполацкага гарадскога аддзела па НС дзяўчынка знаходзілася ў шокавым стане, нага распухла, парушыўся кровазварот. Для яе выратавання давялося ўзламаць секцыі батарэі з дапамогай спецыяльнага гідраабсталявання. Дзяўчынка была паспяхова вызвалена і дастаўлена ў гарадскую бальніцу з дыягназам «удар нагі».

Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.

МАСЛЕНІЦА Ў ГОМЕЛІ

Фота БЕЛТА.

18 лютага на цэнтральнай плошчы Гомеля прайшло народнае гулянне, якое традыцыйна праводзіцца на Масленіцу.

Абавязковым стала ўрачыстае спальванне чучала зімы, пакарэнне слупоў, абвешаных прызамі, і дэгустацыя бліноў, прыгатаваных на свежым паветры.

Упершыню за апошнія дзесяткі гадоў адбылася забытая народная забава — парасячыя скачкі, якія праходзілі на цэнтральнай плошчы горада над Сожам па ўсіх правілах спартыўных спаборніцтваў такога віду. Прама на скачках працаваў таталізатар, і ўсе гледачы перад чарговым забегам маглі рабіць стаўкі на парася, якое спадабалася. Народную забаву дапамаглі арганізаваць прыгарадныя гаспадаркі, якія спецыялізуюцца на вырошчванні свіней, — саўгас-камбінат «Сож» і саўгас-камбінат «Паўднёвы» Гомельскага раёна.

Фота БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПЕРАМОВЫ ПАМІЖ ІЗРАІЛЕМ, ПА І ЗША БЫЛІ НЕЧАКАНА ПЕРАРВАНЫЯ

Трохбаковыя перамовы, якія распачаліся ў панядзелак, 19 лютага, у іерусалімскай гасцініцы «Цытадэль Давіда», былі нечакана перарваныя.

Бакі не каментуюць прычыну спынення абмеркавання. Аднак неафіцыйныя крыніцы паведамляюць, што Абас выказаў крайнюю незадаволенасць пазіцыямі ЗША і Ізраіля, пасля чаго заявіў, што не бачыць сэнсу ў прадаўжэнні перамоў у пашыраным фармаце.

БАЗЫ ПРА Ў ЧЭХІІ І ПОЛЬШЧЫ МОГУЦЬ СТАЦЬ ЦЭЛЯМІ РАСІЙСКІХ РАКЕТ

Калі Чэхія і Польшча сапраўды ўстановяць у сябе амерыканскія базы ПРА, то ракетныя войскі стратэгічнага прызначэння будуць здольныя ў якасці цэляў мець і гэтыя аб'екты. Аб гэтым заявіў камандуючы РВСП Расіі Мікалай Салаўцоў.

«Каэфіцыент тэхнічнай гатоўнасці ракет, якія стаяць на баявым дзяжурстве — 0,97—0,98, гэта значыць, што з кожных ста ракет 97—98 штохвілінна, штосекундна гатовыя выканаць баявую задачу», — заявіў камандуючы. Акрамя таго, Салаўцоў адзначыў, што ў выпадку неабходнасці ў адказ на рашэнне еўрапейцаў размясціць у сябе ПРА, Расія будзе гатовая ў самыя кароткія тэрміны прыняць асіметрычныя меры.

ЗША МОГУЦЬ ЗАСТАЦЦА БЕЗ ВПС

Больш за 800 баявых і дапаможных лятальных апаратаў усіх класаў — 14 працэнтаў ад агульнай колькасці ваенна-паветраных сіл ЗША — сёння не могуць узняцца ў паветра па прычыне выпрацоўкі лётнага рэсурсу.

На сёння сярэдні ўзрост баявых і дапаможных машын ВПС ЗША перавышае 26 гадоў, што з'яўляецца самым нізкім паказчыкам за ўсю гісторыю самастойнага існавання ваенна-паветраных сіл з моманту іх вываду з-пад армейскага камандавання ў 1947 годзе. У самалётаў шэрагу ключавых класаў узрост яшчэ большы. Так, сярэднестатыстычны лятальны танкер КС-135 быў пабудаваны 48, а бамбардзіроўшчык B-52H — 46 гадоў назад. Штогадовы аб'ём закупак новых і мадэрнізаваных самалётаў і верталётаў для ВПС ЗША складае 60 апаратаў усіх класаў, што азначае 100-гадовы перыяд абнаўлення.

ІРЛАНДЦЫ РАЗЛЮБІЛІ GUINNESS

Знакамітае ірландскае піва Guinness губляе папулярнасць у сябе на радзіме, паведамляе The Telegraph.

За апошнія шэсць месяцаў продажы легендарнага цёмнага напою, які вырабляецца вось ужо 250 гадоў, упалі на 10 працэнтаў. На думку кіраўніцтва кампаніі, гэта звязана з «выміраннем» спажыўцоў Guinness. «Вось што адбываецца ў Ірландыі: 50—60-гадовых мужчын, якія прыходзілі ў паб пяць-шэсць разоў на тыдзень і выпівалі за раз пяць-шэсць пінтаў піва (каля 2,5 літра), змянілі больш маладыя кліенты, якія прыходзяць тры разы на тыдзень і выпіваюць дзве-тры пінты», — расказаў дырэктар Diageo Пол Уолш.

МЕТРО: НОВЫЯ СТАНЦЫІ

Сёлета спаўняецца трыццаць гадоў з пачатку будаўніцтва мінскага метрапалітэна. Прынята, што імянінніцы прымаюць падарункі, але не ў гэтым выпадку. Тут усё наадварот: у 2007 годзе метрапалітэн дорыць усім жыхарам краіны дзве новыя станцыі. «Барысаўскі тракт» і «Уручча» прадоўжаць першую лінію метро з боку «Усходу». Праз некалькі гадоў станцыя «Інстытут культуры» ўжо не будзе канцавой, таму што ў бок Малінаўкі пачнуць хадзіць цягнікі ажно да трох новых станцый. І гэта яшчэ не ўсё — згодна з генеральным планам развіцця сталіцы, зацверджаным Прэзідэнтам краіны, да 2030 года ў Мінску можа з'явіцца яшчэ адна лінія метрапалітэна, а аб'яднае паміж сабой усе напрамкі вялізная кальцавая — накшталт Маскоўскай кальцавой лініі. Аб усім гэтым падрабязна карэспандэнт газеты гутарыў з галоўным інжынерам унітарнага прадпрыемства «Мінскметрабуд» Эдуардам ЖУКАВЫМ.

— Эдуард Мікалаевіч, жыхары мікрараёна «Малінаўка» чакаюць, калі і да іх пачне хадзіць метро...

— Так, мы запланавалі ў канцы 2011 — пачатку 2012 года адкрыць тры новыя станцыі — «Грушаўская», «Міхалова», «Пятроўшчына», прычым назва апошняй пакуль што не зацверджана, магчыма, яе назавуць і па-іншаму. Акрамя будаўніцтва гэтых станцый, мы паралельна вядзём і добраўпарадкаванне, рэканструкцыю ўсяго праспекта Дзяржынскага. Работа не проста вялікая, а гіганцкая! На ўсім працягу праспекта, пачынаючы ад будынка Адміністрацыі Маскоўскага раёна і ажно да кальцавой трасы, будуць зроблены трохузроўневыя транспартныя развязкі, добраўпарадкаванне закране літаральна кожны метр. Дадам таксама, што разам з гэтай работай, звязанай і са змяненнем знешняга выгляду тэрыторыі, мы будзем узводзіць неабходныя канструкцыі для будаўніцтва яшчэ адной станцыі метро — «Малінаўка»...

— Дык колькі будзе станцый да пачатку 2012 года: тры ці чатыры?

— Да гэтага часу мы адчынім тры станцыі, а чацвёртую — у канструкцыі. Функцыянаваць «Малінаўка» пачне праз некалькі гадоў пасля «Грушаўскай», «Міхалова», «Пятроўшчыны».

— На якім этапе зараз знаходзяцца работы? Што ўжо зроблена? Ці хопіць часу на ўсё — пяць гадоў не так і шмат для метро...

— Усё скончыць у час рэальна, хоць і сапраўды працуем у напружаным рытме. Зараз вядзецца падрыхтоўчая работа — неабходна знесці жылыя дамы на тэрыторыі, праз якую будзе праходзіць метро. Але вы разумееце, што гарадскія ўлады ў выпадку зносу жыллёвага фонду павінны прадаставіць людзям новыя кватэры, і гэты працэс патрабуе часу. Трэба перакласці сістэму сетак, пабудаваць часовыя аб'екты. Карацей кажучы, тэрміны падрыхтоўчых работ роўныя часу, які неабходны для непасрэдна будаўніцтва станцый метро з усёй «начынкай».

— У час работ частка аўтамабільных дарог будзе зачынена для праезду. Як вырашаецца гэтая праблема?

— Будуць зроблены развязкі і часовыя аб'езды. Апошнія з'явяцца на скрыжаваннях вуліцы Шчорса і праспекта Дзяржынскага, Дзяржынскага і Уманскай, а таксама і ў раёне гандлёвага цэнтра «Кірмаш». Прадугледжана з'яўленне і дубліраў праспекта — дабудуем участак вуліцы Сямашкі. Дарэчы, і праспект газеты «Звязда» на працягу двух гадоў таксама будзе дабудоўвацца, стане больш доўгім.

— Ці праўда, што з падземным грунтам давядзецца «пазмагацца» — ён залішне вільготны?

— Сапраўды, розныя ёсць месцы на ўчастку, але так было заўсёды, таму гэтае пытанне вырашальнае.

— Звернемся ў зусім бліжэйшую будучыню. Колькі каштуе будаўніцтва двух новых станцый «Барысаўскі тракт» і «Уручча»?

— Напрыклад, на 2007 год былі выдаткаваны сродкі ў памеры 80 мільярдаў рублёў. Амаль цалкам яны былі выдзелены з гарадскога бюджэту.

— Якім будзе ўнутраны выгляд новых станцый?

— Над гэтым працуюць з самага пачатку, як толькі была ўбіта ў зямлю першая паля. Зараз адмаўляюцца ад мармуру ў аздабленні сцен, намагаюцца выкарыстоўваць сучасныя, індустрыяльныя матэрыялы. Напрыклад, той жа бетон у афармленні выглядае вельмі прыгожа, калі апрацаваць яго належным чынам.

— Даўно цікавіўся — якая глыбіня метро?

— У Мінску — не зусім вялікая, напрыклад, самае глыбокае месца на адной са станцый дасягае прыблізна 18 метраў ад ўзроўню паверхні.

— А што будзе праз дзесяць, дваццаць гадоў? Кальцавая лінія з'явіцца?

— У плане развіцця горада да 2030 года закладзена з'яўленне трэцяй лініі — ад вуліцы Веры Харужай і фактычна да вакзала. Кальцавая ў праекце таксама ёсць.

— Як плануеце адзначыць юбілей метрапалітэна?

— Як?! Працай!

Гутараў Дзмітрый АЛЬФЕР.



БРЭСЦКАЯ ЛЫЖНЯ:

у трэці раз — за здароўем і добрым настроем



Мінулыя выхадныя ў наваколлі пасёлка Мір, што ў Баранавіцкім раёне, для шматлікіх аматараў лыжнага спорту Брэстчыны сталі эпіцэнтрам добрага настрою і здароўя. Тут прайшлі спаборніцтвы лепшых лыжнікаў рэгіёна з прывычнай ужо назвай «Брэсцкая лыжня-2007».

Аб папулярнасці гэтых стартаў сярод жыхароў Брэсцкай вобласці сведчыць не толькі вялікая колькасць удзельнікаў, якая з кожным годам становіцца ўсё большай, але і той факт, што на свяце здароўя заўсёды можна сустрэць усё кіраўніцтва Брэстчыны на чале з губернатарам Канстанцінам Сумарам. Вось і на гэты раз Канстанцін Андрэевіч на асабістым прыкладзе паказваў многім, як класічны ход адрозніваецца ад каньковага і з задавальненнем пажадаў лёгкай лыжні школьнікам, спартыўным сем'ям, прадстаўнікам сілавых структур і іншым аматарам здаровага ладу жыцця.

Можна не сумнявацца, што выдатнае сонечнае надвор'е ў спалучэнні з добра арганізаваным спартыўным мерапрыемствам далі новы зарад бадзёрасці і энергіі шматсоценнай арміі прыхільнікаў лыжнага спорту рэгіёна і кожны з яго удзельнікаў на сябе прымерыў алімпійскі прынцып: галоўнае не перамога, а ўдзел.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ. Фота аўтара.

Фота БЕЛТА.

17 лютага маладыя воіны 3-й асобнай Чырванасцяжнай брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС прынялі ваенную прысягу. Прытрымліваючыся традыцыі, спецназаўцы правялі паказальныя выступленні і прадэманстравалі баявое майстэрства перад запрошанымі бацькамі.

УП «Минский городской центр недвижимости» информирует, что в извещении о проведении 28 февраля 2007 года 58-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска следует читать:

85	Место в зале ожидания, ул. Ванеева, 34 (торговля периодическими изданиями)	1,50	252
97	Часть помещения, пер. Я. Коласа, 3 (автомат горячих напитков)	2,00	336
41	открытый киоск № 413, в ОТЦ «Столица» пл. Независимости (торговля промтоварами)	18,6	3 129

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже металлорежущих станков, в том числе: токарно-винторезный 1Е-61ПМ, станок токарно-винторезный ФТ-11Ф1, станок круглошлифовальный ЗУ-10А, станок фрезерный 6Р82, станок фрезерный 6Р11, станок фрезерный 6С12. Начальные цены с НДС (бел.руб.) соответственно: 3 150 000, 12 250 000, 8 650 000, 2 970 000, 2 450 000 и 3 700 000. Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.02.2006г. Аукцион состоится 06.03.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 05.03.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.
Контактные телефоны: (8017) 2246134, (801777) 16129.
Наш сайт: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже производственной базы (здания конторы и гаража общей площадью 151,2 кв.м, ограждение территории, благоустройство), расположенной в д. Октябрьская Витебского района. Площадь земельного участка 0,1727 га. Начальная цена — 45 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.11.2006 г. № 253. Аукцион состоится 27 февраля 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 26 февраля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.
КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8-017) 224-61-34.
НАШ САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.02.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 141,00
1 еўра	2 812,63
1 латвійскі лат	4 021,79
1 літоўскі літ	814,49
1 чэшская крона	99,57
1 польскі злоты	720,81
1 расійскі рубель	81,68
1 украінская грыўня	426,71

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,2131
10 UAH	51,7687
1000 BYR	12,1957
EUR	34,4676

Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.02.2007 г.)

USD	2210 / 2315

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ЦІ ЛЁГКІ Ў ФЕРМЕРА ХЛЕБ?

Пытальнік

Аўкцыёны па продажы зямельных участкаў павінны ініцыяваць мясцовыя ўлады

Наша сям'я мае жыллё ў Мінску. Зараз у нас з мужам ёсць жаданне і сродкі для набыцця ў прыгарадзе сталіцы зямельнага ўчастка ў прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання невялікага жылога дома. Згодна з указам Прэзідэнта Беларусі № 58, з першага студзеня 2007 года зямельныя ўчасткі для будаўніцтва ў прыгарадных зонах прадастаўляюцца грамадзянам, якія не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у прыватную ўласнасць на аўкцыёнах па продажы зямельных участкаў для індывідуальнага будаўніцтва. Які парадак правядзення аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў для індывідуальнага будаўніцтва ў прыгарадзе сталіцы? Дзе магчыма адшукаць інфармацыю аб правядзенні такіх аўкцыёнаў? Вядома, што заява грамадзяніна аб прадастаўленні зямельнага ўчастка для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома разглядаецца з улікам зацверджанага генеральнага плана сельскага населенага пункта... а таксама з улікам наяўнасці не асвоеных для жыллёвага будаўніцтва зямельных участкаў у сельскіх населеных пунктах. Дзе і як магчыма азнаёміцца з генеральным планам канкрэтнага прыгараднага населенага пункта (напрыклад, у межах Хацяжынскага сельсавета) і атрымаць інфармацыю аб наяўнасці там не асвоеных для жыллёвага будаўніцтва зямельных участкаў?

Галіна ЖЫВІЦКАЯ,
г. Мінск.

— Аўкцыёны па продажы зямельных участкаў для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва праводзяцца мясцовымі выканаўчымі камітэтамі, па месцы знаходжання зямельных участкаў, — адказалі рэдакцыі ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці Беларусі. — Парадак правядзення аўкцыёнаў вызначаны Палажэннем аб правядзенні аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, зацверджаным пастановай урада ад 31 снежня 1997 г. № 1790. Згодна з гэтым дакументам, падрыхтоўка і арганізацыя правядзення аўкцыёну ажыццяўляецца камісіяй, якая ствараецца рашэннем выканкама. Аб'ява аб правядзенні аўкцыёну па продажы зямельных участкаў друкуецца ў сродках масавай інфармацыі па выбару камісіі не пазней за адзін месяц пасля правядзення аўкцыёну.

Азнаёміцца з зацверджаным генеральным планам сельскага населенага пункта ў Мінскім раёне можна ў тэрытарыяльным органе архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінскага райвыканкама.

Сяргей КУРКАЧ.

На падвядзенне вынікаў работы на зямлі фермерскіх (сялянскіх) гаспадарак Гомельшчыны сёлета з'явілася іх прадстаўнікоў больш, чым летась, хоць гэтых гаспадарак на 30 паменшала. Актыўнасць людзей у пэўнай ступені тлумачылася тым, што старшыня абласной асацыяцыі фермераў, кандыдат сельскагаспадарчых навук М. Байда ў канцы мінулага года ў рамках праграмы культурнага і прафесійнага абмену знаёміўся з работай фермерскіх гаспадарак штатаў Каліфорнія і Невада ЗША. Таму ім, вядома ж, хацелася даведацца з жывой гутаркі свайго кіраўніка, як ідуць справы там, «за бугром», у іх калег, чым яны жывуць і г.д.

Аднак сваё выступленне Міхаіл Лявонцьевіч пачаў не з гэтага, а з таго, чаго дабіліся фермеры вобласці за мінулы год. На пачатак года на Гомельшчыне было 245 фермерскіх (сялянскіх) гаспадарак. Найбольш — у Жлобінскім, Рэчыцкім, Рагачоўскім, Гомельскім (30, 29, 23 і 24 адпаведна), а найменш — у Чачэрскім, Брагінскім і Нараўлянскім (3, 2 і 0), прычым на Нараўляншчыне адзіная фермерская гаспадарка распалася літаральна перад самым Новым годам. У фермераў — 14 496 гектараў зямлі, з якіх 12 761 га сельгасугоддзяў і 9117 га ворыва з тых сельгасугоддзяў. Іншымі словамі, у фермераў 1,12 працэнта зямлі. Астатняя — у КСУПаў і СВК. Няцяжка падлічыць, што ў сярэднім на кожную фермерскую гаспадарку прыпадала 52,1 гектара сельгасугоддзяў і 37,2 — ворыва.

У агульных поспехах сельгасвытворцаў вобласці доля фермераў — 1,3 працэнта збожжа, 12 — бульбы, 17,4 — агародніны, каля працэнта мяса і малака. А ў цэлым, паўтараем, валодаючы 1,12 працэнта зямлі, яны здабылі 8 працэнтаў сельгаспрадукцыі. Фермерскія гаспадаркі ў параўнанні з сельскагаспадарчымі ўнітарнымі прадпрыемствамі і вытворчымі кааператывамі дабіліся большай ураджайнасці з гектара: бульбы — на 52 цэнтнеры, агародніны — на 53.

Сапраўдны флагман фермерскага руху не толькі на Гомельшчыне, але і ў рэспубліцы (аб чым наша газета ўжо неаднойчы расказвала) — гаспадарка Міхаіла Шруба з Жыткаўшчыны. У Міхаіла Рыгоравіча кожны гектар жыта даў 41,3 цэнтнера, у СВК і КСУПах — 12,3, пшаніцы азімай — 38,8 (25,3), трыцікале азімага — 60,9 (20,5), ячменю яравога — 35,7 (20,3), аўса — 36,9 (15,3), бульбы — 303 (183), гародніны — 516 (160), з іх капусты — 70,3 (324), агуркоў — 480 (117), памідораў — 420 (92) і г.д.

Вядома ж, не ўсе фермеры могуць пахваліцца такімі паказчыкамі, але многія з іх год ад году ўсё больш эфектыўныя: Леанід Парвянкоў, Васіль Змушка, Мікалай Лагвіненка, Юрый Нямцоў, Савелій Белаболаў — усіх не пералічыш. Відавочна, што фермерскія гаспадаркі ўносяць значны ўклад у выкананне харчовай праграмы краіны. Але ён быў бы куды большы пры яшчэ большай падтрымцы іх з боку дзяржаўных органаў.

Давайце зазірнём у статыстыку. З 1990 года, калі фермерства ў рэспубліцы пачынала першыя крокі, да 1996-га ў вобласці колькасць ахвотнікаў самастойна гаспадарыць нязменна расла — з 15 да 433! А потым усё пакацілася ўніз: 1997-ы — 422, 2000-ы — 399, 2004-ы — 331, 2005-ы — 279, 2006-ы — 258, па стану на 1 студзеня сёлета, паўторымся, — 245.

Звернем увагу і на такую акалічнасць: у 2005 і 2006 гадах «завязалі» з фермерскай дзейнасцю адпаведна 36 і 28 чалавек, а на іх месцы прыйшло па 15 гаспадароў. І гэта не толькі ва ўказаныя гады, і раней такое назіралася, што сведчыць: у адных (такіх большасць) знікла ахвота займацца фермерствам, у другіх (такіх меншасць) яна з'явілася. Значыць хоць і скарачаецца на Гомельшчыне фермерскі рух, але ўсё ж ён жыве.

Магчыма, гэта і ёсць натуральны працэс развіцця фермерства пры ўсіх тых акалічнасцях, якія склаліся ў рэгіёнах рэспублікі, і тых здольнасцях, уменні і старанні фермераў, якімі яны валодалі або валодаюць. Правільна, не ўсе яны мелі добрыя веды належнага вядзення гаспадаркі, як правільна і тое, што ў іх была надзея: дзяржава іх навучыць, падкажа, падтрымае, дапаможа. Бо яны клапоцяцца не толькі аб сваім дабрабыце, але і дабрабыце грамадства.

Аб гэтым і вялася размова на сходзе. Прыводзіліся наступныя прыклады. Летась фермеры вобласці заплацілі 1400 мільёнаў рублёў падаткаў і плацяжоў. Калі зрабіць разлікі платы іх адпаведна за карыстанне аднаго гектара сельгасугоддзяў і ворыва, дык атрымліваецца сума ў 105 358 і 154 253 рублі. А ў СВК і КСУПах гэтыя сумы складаюць 35 171 і 63 344 рублі. Чаму?

Больш за тое, некаторыя мясцовыя органы ўлады не захоўваюць і іншыя патрабаванні новага Закона «Аб сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках», які выраўняў іх з СВК і КСУПамі. Незразумела, чым кіраваўся Гомельскі гарвыканкам, калі летась у кастрычніку ўнёс змяненне ў ранейшае (ліпеньскае) рашэнне і абавязаў вялікую колькасць арганізацый абласнога цэнтра закупляць бульбу і прадукцыю з гародніны толькі ў КСУПа «Камбінат «Усход», нягледзячы на тое, што раней былі заключаны дагаворы на пастаўку іх фермерскімі гаспадаркамі.

А колькі было нараканняў фермераў, што ім выдзяляліся непрыдатныя землі і гэтым пытаннем нават займалася пракуратура; што і зараз (ужо не першы год) фермер Леанід Парфянкоў, напрыклад, просіць пашырыць сваю гаспадарку на 300 гектараў, ды нічога з гэтага не атрымліваецца; што кіраўнікі асобных гаспадарак вобласці Гомельскага і Хойніцкага раёнаў адмаўляюць фермерам Аляксандру Казлову і Андрэю Лутчыку ў выкарыстанні жывёлагадоўчых памяшканняў, якія пустуюць; што толькі пасля ўмяшання пракуратуры фермеры Аляксандр Фядзянін з Гомельскага і група фермераў з Акцябрскага раёнаў былі забяспечаны дызельным палівам, мінеральнымі ўгнаеннямі і сродкамі аховы раслін у час правядзення веснавых палявых работ 2006 года! І гэтак далей, і таму падобнае.

Міхаіл Байда паскардзіўся, што чамусьці не працуе пункт 3 артыкула 25 новага Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках», паводле якога могуць прадастаўляцца льготныя крэдыты ў межах сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія накіроўваюцца на гэтыя мэты, з аплатай працэнтаў за карыстанне імі ў памеры не больш за палову стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з другога года пасля атрымання крэдыту. І калі ён адносна гэтага зрабіў запыт ад імя абласной асацыяцыі фермераў ў маі мінулага года, дык адказу ніякага не атрымаў.

Дарэчы, атрыманне фермерамі крэдытаў — пытанне асобнае. Па службовых справах Міхаілу Байдзе давялося быць у камандзіроўках у Германіі, Літве, Расіі, Украіне і Злучаных Штатах Амерыкі. І калі ў нас працэнт за карыстанне крэдытам для фермераў складае 14 (а раней было нават 18), дык у іншых краінах ён куды ніжэйшы. Напрыклад, для фермераў Каліфорніі дзейнічаюць тры віды крэдытаў: кароткатэрміновы — да двух гадоў на набыццё паліва, насення, мінеральных угнаенняў пад 8,25—8,5 працэнта гадавых; сяроднетэрміновы — да сямі гадоў (абсталяванне, сельгастэхніка) пад 7—8 працэнтаў; доўгатэрміновы — да 20 гадоў (закладка садоў, вінаграднікаў, купля зямлі, узвядзенне капітальных збудаванняў) пад такія ж працэнты.

У 2005 годзе сярэдняя памеры крэдыту складалі 375 тысяч долараў. Абавязковая ўмова: для атрымання сярэдне-, і доўгатэрміновага крэдыту дэталёва правяраецца фінансавае становішча фермерскай гаспадаркі, наяўнасць залогу на той выпадак, калі фермер можа збанкруціцца. А вось калі фермер толькі пачынае сваю дзейнасць, гарантам атрымання крэдыту можа стаць урад.

Цікава яшчэ і тое, што ніхто фермераў не прымушае страхаваць сваю маёмасць, бо гэта — справа добраахвотная. Яны маюць свой рынак, дзе гандлююць. Дзесяць працэнтаў іх вырошчваюць экалагічна чыстую прадукцыю, якая ў два-тры разы даражэйшая за звычайную...

Павучальным з'яўляецца і тое, што для вырашэння нейкіх праблем група фермераў аб'ядноўваецца ў кааператыў, які распадаецца, калі пытанне будзе рэалізавана. Цікавасць выклікала і прымяненне на пасевах люцэрны раундапа супраць пустазелля, які ўздзейнічае толькі на апошняе, бо ў генетычна мадыфікаваным сорце люцэрны закладзены ген устойлівасці яе да раундапа, і ён не шкодзіць гэтай расліне. Дарэчы, пасевы люцэрны, гэтай выдатнай бялковай кармавой культуры, паліваюцца вадой, што дае магчымасць за год скошваць яе 6—7 разоў (у нас — толькі два разы).

Адзін гектар яблынь, напрыклад, японскага гатунку «Фуджы» «выдае на гара» 70—75 тон пладоў. Дарэчы, апрацоўка іх ад шкоднікаў — да шасці разоў.

Падаткі з амерыканскіх фермераў вялікія — 35—40 працэнтаў, і ў іх справы ўмешваюцца толькі падатковыя інспектары і экалагічныя службы. Астатнія ж дзяржаўныя органы на праверцы фермерскіх гаспадарак не задзейнічаны...

Безумоўна, чужы вопыт на нашу глебу аўтаматычна пераносіць не варта, але пашукаць тут нешта талковае, напэўна, усё ж карысна...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.



Адзінокія людзі,
вас быццам няма —
Грамадою мы
ў працы і свяце,
За вясёлым сталом
вас чакаюць дарма
І гасцей не чуваць
ў вашай хаце,

Сябра вас не знайшоў,
зорны час не прыйшоў,
Да высокіх пасад
не прызначаны...
...Але вось адчагосьці
на картах баёў
Адзінокія дрэвы
пазначаны.

ЗЛАЧЫННЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Злачынная група з грамадзян Беларусі, Украіны, Малдовы, Ірака арганізавала нелегальны канал перапраўкі мігрантаў з тэрыторыі Расіі праз Беларусь, Украіну і далей у краіны Заходняй Еўропы. Следствам устаноўлена, што толькі з ліпеня да кастрычніка мінулага года праз тэрыторыю Пінскага раёна каля вёскі Боркі было нелегальна перапраўлена на ўкраінскі бок 13 груп мігрантаў па 4—6 чалавек. Але восенню «перапраўшчыкі» трапілі ў поле зроку памежнікаў і супрацоўнікаў дзяржбяспекі.

Як паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці, следства ў адносінах да злачыннай групоўкі завершана, справа перададзена ў суд.

Яна СВЕТАВА.

МЯСА НАМ — ШКУРЫ ІМ

Супрацоўнікі АБЭЗ сумесна з пагранічнікамі зазірнулі да жыхаркі вёскі Павіцце Кобрынскага раёна і знайшлі ў яе 9 тон шкур буйной рагатай жывёлы. Тавар быў падрыхтаваны для незаконнай перавозкі на Украіну. Шкуры канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«ПАЖАРТАВАЎ...»

38-гадовы лайдак з Добрушскага раёна сілком засунуў пад вопратку падлетка петарду, і той з апёкам спіны другой ступені апынуўся ў бальніцы. Праваахоўныя органы кваліфікавалі «жарт» (так зламыснік растлумачваў свае дзеянні) як учыненне злоснага хуліганства.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

28 февраля 2007 года

СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «КАМВОЛЬ»

Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал 4-й этаж главного корпуса.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об утверждении Устава ОАО «Камволь» в новой редакции.
2. Об утверждении метода переоценки основных средств.
3. О внесении изменений в договор купли-продажи здания общежития № 2 ЖСК «КамвольСтрой» в части продления сроков оплаты.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, к. 204 (2-й этаж управления), тел. 221-14-20, 2-97.

Начало работы собрания — 14.00.

Регистрация участников собрания с 13.10 до 13.55.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 20.02.2007 г.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

ОАО «КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ»
извещает акционеров о проведении 22 марта 2007 года в 12.00 очередного собрания по адресу: г. Витебск, проспект Ген. Людникова, 10.

Повестка дня:

1. Об итогах деятельности Общества за 2006 год и об основных направлениях деятельности Общества в 2007 году.
2. Утверждение отчета ревизионной комиссии.
3. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2006 год и о дивидендах за 2006 год.
4. О направлении использования чистой прибыли в 2007 году.
6. Утверждение Устава в новой редакции.
7. Утверждение условий вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в читальном зале библиотеки с 15 марта 2007 года в рабочие дни с 11.00 до 17.00.

Регистрация участников очередного собрания акционеров будет производиться с 10.00 до 11.45 на основании документа, удостоверяющего личность (представитель акционера должен иметь доверенность).

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания — 1 марта 2007 года.

Справки по тел. (8-0212) 24-77-19.

Наблюдательный совет ОАО «Красный Октябрь».

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 января 2007 года

Наименование банка и его местонахождение:

ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», г. Минск, код 725, ул. Мельникайте, 8

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2006 г.	2005 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	3255,3	2232,3
3	Средства в Национальном банке	1102	2	5509,0	9182,2
4	Ценные бумаги:	1103		5716,2	5733,9
	для торговли	11031	3	5716,2	5629,4
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	-	-
	в наличии для продажи	11033	3.2	-	104,5
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	13610,3	12027,1
6	Кредиты клиентам	1106	5	35629,4	33335,8
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	-	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	12794,7	7972,7
9	Прочие активы	1109	8	1694,8	2706,7
10	**ИТОГО АКТИВЫ**	**110**		**78209,7**	**73190,7**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	14874,3	15115,5
14	Средства клиентов	1206	11	35673,7	25691,9
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		130,7	9735,2
16	Прочие обязательства	1209	12	2937,0	3183,7
17	**ВСЕГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**	**120**		**53615,7**	**53726,3**
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	7042,4	7049,5
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		1694,2	1395,7
22	Накопленная прибыль	1214	14	8818,5	5098,5
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	7038,9	5920,7
24	**ВСЕГО КАПИТАЛ**	**121**		**24594,0**	**19464,4**
25	**ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ**	**12**		**78209,7**	**73190,7**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	ТРЕБОВАНИЯ	1301	16	24208,9	25184,1
28	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	1302	17	14360,6	19112,5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 января 2007 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2006 г.	2005 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		6896,8	5597,0
2	Процентные расходы	2012		3432,5	2394,8
3	**Чистые процентные доходы**	**201**	**18**	**3464,3**	**3202,2**
4	Комиссионные доходы	2021		6746,0	5710,5
5	Комиссионные расходы	2022		213,5	242,5
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**	**19**	**6532,5**	**5468,0**
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	2163,2	1439,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	-113,7	71,1
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	125,3	-44,5
11	Прочие доходы	207	23	600,2	202,3
12	Операционные расходы	208	24	7746,6	6253,6
13	Прочие расходы	209	25	428,8	930,3
14	Налог на прибыль	210		623,1	697,4
15	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**		**2**	**3722,7**	**2546,3**

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2006 год

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование показателей и статей капитала	Символ	Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль	Фонд переоценки статей баланса	Всего капитал (сумма граф 4–8)
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	Остаток на начало года	3011	7049,5	-	1395,7	5098,5	5920,7	19464,4
2	Изменения статей капитала в течение отчетного года, в том числе:	3012	(-7,1)	-	+298,5	+3720,0	+1118,2	+5129,6
2.1	Прибыль (убыток со знаком «минус») отчетного года	30121	X	X	X	+3722,7	X	+3722,7
2.2	Направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	X	+1,2	(-1,2)	X	-
2.3	Направление фонда дивидендов на выплату акционерам	30123	X	X	X	(-1,5)	X	(-1,5)
2.4	Внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	30124	-	-	X	X	X	-
2.5	Проведение переоценки статей баланса	30125	X	X	X	X	+1415,5	+1415,5
2.6	Перераспределение между статьями капитала	30126	-	-	+297,3	-	(-297,3)	X
2.7	Прочие изменения	30127	(-7,1)	-	-	-	-	(-7,1)
3	Остаток на конец года	3013	7042,4	-	1694,2	8818,5	7038,9	24594,0

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ
на 1 января 2007 года

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2006 г.	2005 г.
1	2	3	4	5	6
1	ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ				
2	Полученные процентные доходы	7010		+6896,8	+5597,0
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-3404,1	-2394,8
4	Полученные комиссионные доходы	7012		+6746,0	+5710,5
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-213,5	-249,6
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		+2163,2	+1439,5
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		-80,6	+71,1
8	Доход в форме дивидендов	7016		-	-
9	Прочие полученные доходы	7017		+534,7	+16,7
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-7652,5	-6664,7
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-511,8	-509,9
12	Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и обязательствах	701		+4478,2	+3015,8
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		-3840,0	-224,6
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах	7021		+66,6	-4735,8
15	Чистое снижение (прирост) кредитов и других денежных средств в банках	7022		-4741,0	+4701,2
16	Чистое снижение (прирост) кредитов, выданных клиентам	7023		-2188,1	-10 886,0
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		+810,0	-1691,7
18	Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов	702		-9892,5	-12 836,9
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030		-	-
20	Чистый прирост (снижение) кредитов и других средств банков	7032		-270,1	+3 740,3
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		+10 650,1	+9311,5
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		-9438,3	+6089,0
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		-1162,3	+1757,4
24	Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств	703		-220,6	20 898,2
25	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		-5634,9	+11 077,1
26	ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ				
27	Приобретение основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7110		-3890,8	-787,2
28	Реализации основных средств, нематериальных и других долгосрочных активов	7111		-5,7	+77,2
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений	7112		-	-
30	Реализация долгосрочных финансовых вложений	7113		-	-
31	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		-3896,5	-710,0
32	ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ				
33	Эмиссия акций	7211		-	-
34	Выкуп собственных акций	7212		-7,1	-54,7
35	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213		-	-
36	Выплата дивидендов	7214		-2,7	-2,3
37	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		-9,8	-57,0
38	Влияние изменений официального курса на денежные средства и их эквиваленты	73		-97,3	-144,8
39	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		-9638,5	10 165,3
40	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740		X	15 205,0
41	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741		5 566,5	X

Председатель Правления Киреев А.Е. Главный бухгалтер Кузьмицкая Н.А.

Дата подписания 26 января 2007 г.
Проверенный годовой отчет соответствует требованиям законодательства Республики Беларусь.
Достоверность форм годового отчета подтверждена во всех существенных аспектах.
Директор АООО «Аудитэл» Папковский А.И.

14 февраля 2007 года состоялось Общее Собрание акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

С основным докладом «Об итогах работы ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в 2006 году и Программе развития банка на 2007 год» выступил Председатель Правления Андрей Киреев. Минувший год оказался весьма плодотворным для банка. Балансовая прибыль по состоянию на 01.01.2007г. составила 3,7 млрд. руб., увеличившись за год в 1,5 раза. Чистые активы составили 78,2 млрд. руб. Собственный капитал возрос за 2006 год на 18,4% и достиг 23,2 млрд. руб. По показателю рентабельности чистых активов банк устойчиво входит в первую тройку отечественных кредитно-финансовых учреждений.

В отчётном докладе Председатель Правления ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» А.Киреев отметил обеспечение высокой возвратности кредитов. Доля проблемных кредитов в портфеле по состоянию на 01.01.2007г. составила всего 0,7% (в прошлом году — 1,1 %).

Докладчик, проанализировав работу банка в 2006 году по всем направлениям деятельности, сделал вывод: Белорусский Индустриальный банк укрепил конкурентные позиции в банковском сегменте страны.

Акционеры утвердили отчёт за 2006 год, а также «Программу развития ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» на 2007 год», основные направления которой предусматривают увеличение уставного фонда и собственного капитала банка, наращивание объёмов кредитования реального сектора экономики, расширение клиентской базы, укрепление позиций банка в обслуживании внешнеэкономической деятельности клиентов. Утверждены нормативы распределения чистой прибыли на 2007 год.

Акционерами избран Наблюдательный Совет в составе трёх человек. Председателем Наблюдательного Совета переизбран Коцаренко Владислав Александрович.

По всем вопросам, рассмотренным на Общем Собрании акционеров, были приняты соответствующие решения.

Лицензия НБ РБ на осуществление деятельности № 20 от 13.02.2007 г.

«Крылатая» хвароба

Падстаў для панікі няма

Але асцярожнасць — не нашкодзіць

Трывожныя звесткі, што прыйшлі напрыканцы мінулага тыдня з Падмаскоўя, дзе ў пяці раёнах спецыялістамі быў выяўлены высокапатагенны вірус птушынага грыпу, былі абмеркаваныя ўчора на пасяджэнні Міжведамаснага каардынацыйнага савета па пытаннях аховы тэрыторыі Беларусі ад заносу і распаўсюджвання птушынага грыпу.

— Мы даўно знаходзімся ў поўнай «баявой» гатоўнасці, — паведаміў журналісту «Звязды» Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь і старшыня міжведамаснага савета Міхаіл Рымжа. — Наш савет збіраецца на аператыўныя нарады літаральна кожны тыдзень. І ў нас пакуль што няма падстаў для прыняцця нейкіх дадатковых мераў. Яшчэ ў студзені гэтага года быў зацверджаны комплексны план мерапрыемстваў па прафілактыцы птушынага грыпу на 2007 год. Пад самым жорсткім кантролем знаходзяцца ўсе прадпрыемствы па птушкагадоўлі, харчовыя рынкі, патэнцыяльна небяспечныя транспартныя накірункі і паветраныя калідоры. У хуткім часе распачнецца вакцынацыя свойскай птушкі ад птушынага грыпу ў населеных пунктах, размешчаных непадалёк ад адкрытых вадаёмаў і птушкафабрык.

Дарэчы, у Падмаскоўі ахвярай небяспечнага віруса стала менавіта свойская птушка. На птушкафабрыкі вірус не паспеў «прасачыцца». У ходзе праведзенага эпізаатычнага расследавання было ўстаноўлена, што ўся інфіцыраваная птушка набывалася ў аднаго і таго ж перакупшчыка на птушыным рынку, размешчаным на паўднёвым усходзе Масквы. Зараз вакол усіх населеных пунктаў, дзе былі выяўлены «ачагі» птушынага грыпу, установлена карантынная зона. Выпадкаў інфіцыравання птушыным грыпам сярод людзей, на шчасце, няма. Але ўсе гаспадары загінулай птушкі знаходзяцца пад медыцынскім наглядам.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Школа падаткаплацельшчыка

ВЫЛІК ПА КОШТУ ЗЯМЕЛЬНАГА ЎЧАСТКА НЕ ПРАДУГЛЕДЖАНЫ

Сёння мы распачынаем штотыднёвую рубрыку па пытаннях падаткаабкладання. Зараз па самых актуальных і цікавых напрамках гэтай тэмы рэдакцыі адказвае старшы дзяржаўны інспектар Міністэрства па падатках і зборах РБ Аляксандр ЗЯЛЕЎСКІ.

— Маю дваіх непаўналетніх дзетак. Разведзеная. Былы муж пазбаўлены бацькоўскіх правоў, таму аліментаў не плаціць. Ці магу я атрымліваць у бухгалтэрыі сваёй арганізацыі стандартны падатковы вылік у двайным памеры пры вылічэнні падаходнага падатку як адзінокая маці, якой па сутнасці з'яўляюся?

Антаніна Зельва, *г. Мінск.*

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў», фізічныя асобы, на ўтрыманні якіх ёсць дзеці да 18 гадоў ці дзеці-ўтрыманцы, маюць права на вылік з атрыманых даходаў пры вылічэнні падаходнага падатку ў памеры 2 базавых велічынь на кожнае дзіця за кожны месяц падатковага перыяду. Пры гэтым удовам (удаўцам), адзінокім бацькам, апекунам ці папячыцелям гэты падатковы вылік даецца ў двайным памеры.

Згодна з адпаведнымі інструкцыямі Міністэрства па падатках і зборах РБ, дакументам, які пацвярджае права на атрыманне стандартнага падатковага выліку ў двайным памеры для адзінокіх бацькоў, з'яўляецца даведка, якая выдаецца аддзелам ЗАГСа, дзе ёсць звесткі з кнігі запісаў аб нараджэнні аб тым, што звесткі аб бацьку (маці) запісаны па ўказанню маці (бацькі). У выпадку адсутнасці гэтага дакумента падатковыя агенты (у вашым выпадку бухгалтэрыя прадпрыемства) пры вылічэнні падаходнага падатку не маюць права на прадастаўленне стандартнага падатковага выліку ў двайным памеры.

З улікам таго, што ў разглядаемай сітуацыі такая даведка спадарыні Антаніне выдадзена не будзе (бацька дзяцей вядомы), стандартны падатковы вылік прадастаўляецца ёй у памеры 2 базавых велічынь на кожнае дзіця.

— Стаю ў чарзе як маючы патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Набыў прыватны дом. У дагаворы куплі-продажы кошт набытай маёмасці быў падзелены на дзве часткі: кошт жылога дома і цана зямельнага ўчастка, які быў прадастаўлены для абслугоўвання жылога дома. Па выніках года падаў дэкларацыю ў падатковы орган, каб атрымаць падатковы вылік. Аднак падатковы вылік далі толькі на кошт жылога дома. Ці з'яўляюцца дзеянні падатковых інспектараў справядлівымі?

Аляксей К., *Магілёўская вобласць.*

— Згодна з законам, фізічныя асобы, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і якія накіроўвалі на працягу года грашовыя сродкі на будаўніцтва ці набыццё жылля (пагашэнне крэдытаў на гэтыя мэты), маюць права на вылік гэтых сум з даходаў пры вылічэнні падаходнага падатку.

Што датычыцца сум, якія былі накіраваны фізічнымі асобамі на набыццё зямельных участкаў, то ў адносінах да такіх расходаў не працуе ні адна з ільгот, прадугледжаных законам. Дзеянні ў гэтым накірунку падатковых інспектараў з'яўляюцца правільнымі.

З гэтага тыдня ўсе складаныя і актуальныя пытанні, звязаныя з падаткаабкладаннем, чытачы «Звязды» могуць задаць штодзень з 10.00 да 12.00 гадзін па тэлефоне рэдакцыі (017) 287-17-51 або даслаць на адрас газеты лістом.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Масленіца праходзіць — вясна надыходзіць!

Вясёлае і гарэзлівае свята тыдзень крочыла па краіне. Шэсць дзён, пасля якіх надыходзіць сёмы — даравальная нядзеля — здаўна лічацца аднымі з самых важных у годзе. Як-ніяк, хутка прыйдзе цяпло, разам з ім трэба будзе ніву будучага ўраджаю апрацоўваць, а з панядзелка пост пачынаецца. Таму хочуць людзі наблізіць ласкавае, лагоднае веснавое сонейка і без суму развітваюцца з Зюзяй — беларускім богам зімы.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

У Заслаўі праводзіць зіму горад пачаў з адзінаццаці гадзін раніцы. Калі яшчэ будзе магчымасць узлезці на традыцыйны святочны слуб? Ён доўгі, мабыць, каля трох паверхаў у вышыню, а на самым яго версе падарункі падрыхтаваны. Але каб забраць іх, трэба караскацца па адпаліраванай драўлянай паверхні. «Ну, хто наступны за падарункамі, — чуецца, — смялей, хлопцы, пахваліцеся сваёй моцай».

І як не паспрабаваць, не пахваліцца, калі тут і меранне сілаю, і спартыўныя спаборніцтвы для дзятвы, і нават сучасны дартс — кіданне дроцікаў. А блазны яшчэ так і падахвочваюць, і разам з імі сама гаспадыня Масленіца запрашае да весялосці. Дарэчы, рэальны персанаж. Юля Калачка, самая што ні на ёсць жывая дзяўчына — у звычайныя дні года яна працуе метадыстам у мясцовым Доме культуры і працягвае навучанне ва ўніверсітэце культуры. Вось такая прыходзіць кожны год Масленіца да жыхароў Заслаўя — вясёлая прыгажуня ў нацыянальным строі, і, вядома ж, з блінамі ў руках. Якія провады зімы без гэтай стравы? «Будзем людзей весяліць, гулянні ладзіць, якія заўсёды былі ў гэты дзень. Напрыклад, блінныя баталіі праводзіць. Пераможа ў іх той, хто сярэдзіну бліна з'есць так, каб пакінуць ад яго як мага меншы абадок, — кажа Масленіца-Юля. — А якое свята без кулачнай бойкі? Сёння мы змянілі яе правілы — яны сталі нават цяжэйшымі. Біцца асілкі будуць з... цукеркамі. Няхай хлапцы, на руках якіх будуць апрануты баксёрскія пальчаткі, паспрабуюць зняць з цукеркі фанцік».

Вось так і трэба праводзіць зіму — з вясёлым настроем, пад гукі беларускай музыкі. Усміхнёмся ёй — была яна добрай, і скажам, не развітваючыся — да пабачэння. Сустрэнемся зноў!

Дзмітрый АЛЬФЕР.

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

МЕДЫЦЫНА: ПРАБЛЕМА — КАДРЫ?

Летась на Міншчыне ўзрасла колькасць урачэбных амбулаторый і бальніц сястрынскага догляду, а вось фельчарска-акушэрскіх пунктаў стала на 6 менш (паводле апошніх даных, у вобласці працуе 471 ФАП). Як тлумачаць спецыялісты, сэрвіс зусім не «згортваецца», а набывае новыя формы. Гэта дазваляе паляпшаць якасць абслугоўвання, павялічваць яго даступнасць для ўсіх пацыентаў. Без падзелу іх на «вясковых» і «гарадскіх». Дарэчы, менавіта на гэта скіраваны ўсе тыя пераўтварэнні, якія адбываюцца ў медыцынскай галіне. Наколькі яны паспяховыя? Гэта імкнуліся высветліць удзельнікі выніковага пасяджэння калегіі ўпраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама, якое адбылося ў Барысаве.

Выдаткі на развіццё медыцыны ў цэнтральным рэгіёне летась склалі 385,5 мільярда рублёў. Гэта на 54 млрд (на 19 працэнтаў) больш, чым было выдзелена пазалетась. У сярэднім на кожнага жыхара сталічнай вобласці прыпадала амаль па 260 тысяч рублёў бюджэтных сродкаў. Разгарнулася будаўніцтва новых аб'ектаў: Старобінскай бальніцы, урачэбнай амбулаторыі ў вёсцы Маркава Мядзельскага раёна, хірургічнага корпуса абласной дзіцячай бальніцы, а таксама блока Капыльскай ЦРБ. Рэканструкцыя аперацыйных залаў і рэанімацыйных месцаў зроблена ў дзевяці цэнтральных раённых бальніцах.

— Па многіх параметрах мы ні ў чым не саступаем замежным сістэмам, таму ёсць рэальная магчымасць для экспарту медыцынскіх паслуг, — лічыць **намеснік міністра аховы здароўя Міхаіл РЫМЖА**.

Летась у медыцынскіх установах Мінскай вобласці прайшлі лячэнне 1,5 тысячы замежных грамадзян — удвая больш, чым у 2005 годзе. Даход ад аказання платных паслуг склаў 130,3 млн рублёў. Дадатковыя магчымасці ў хуткім часе з'явяцца і ў жыхароў сталічнай вобласці — у Маладзечне, Жодзіне і Барысаве плануецца стварыць спецыялізаваныя ўнітарныя прадпрыемствы лячэбна-прафілактычнага профілю. Платныя медыцынскія паслугі, якія прапануюць гэтыя дзяржаўныя ўстановы, складуць канкурэнцыю прыватным цэнтрам. Мяркуецца, што расцэнкі тут будуць самымі даступнымі.

Праўда, ёсць даволі вострая кадравая праблема — напрыклад, паводле інфармацыі Барысаўскага раённага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання, адзін з самых буйных гарадоў Міншчыны на 64 працэнты ад патрэбы ўкамплектаваны ўрачамі і на 33 — вузкімі спецыялістамі. Вялікі дэфіцыт урачоў-анколагаў. На адпаведных стаўках па сумяшчальніцтву працуюць спецыялісты функцыянальнай і промневай дыягностыкі, хірургі і нават гінеколагі.

Адзначаецца трывожная тэндэнцыя: у мінулым годзе на Міншчыну было размеркавана на чвэрць маладых спецыялістаў менш, чым пазалетась. Выпуск 2007 года, нават пры самым удалым раскладзе, зможа задаволіць патрэбу хіба толькі на трэць. Па ўсёй сістэме даволі адчувальны «кадравы голад»: патрабуюцца 30 неўролагаў, 35 рэнтгенолагаў, 44 хірургі, 49 акушэраў-гінеколагаў, 18 ЛОР-урачоў, 21 афтальмолаг і 39 анестэзіёлагаў-рэаніматолагаў.

Як прывабіць патрэбнага спецыяліста? Свой вопыт ёсць у прысталічным раёне — сюды маладыя медыкі імкнуцца патрапіць. Заробкі на «малой Міншчыне» адны з самых высокіх (у сярэднім каля 600 тысяч рублёў). Акрамя таго, як паведаміў **намеснік старшыні Мінскага райвыканкама Ігар ЗІНОВІЧ**, спецыялістаў уключаюць у склад дольшчыкаў ЖБК альбо выдзяляюць ім зямельныя ўчасткі для індывідуальнага будаўніцтва. У выніку сярэднім медперсаналам Мінскі раён забяспечаны на 99 працэнтаў, а ўрачамі — на 96.

— Кадры сярэдняга звяна рыхтуюць тры медыцынскія вучылішчы — у Барысаве, Маладзечне і Слуцку, — заўважае **начальнік упраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама Іван ЛІПНІЦКІ**. — Яны рыхтуюць спецыялістаў лячэбнага, сястрынскага, зубалячэбнага і медыка-дыягнастычнага профілю. Калі яшчэ некалькі гадоў таму на рынку працы быў лішак такіх кадраў, то цяпер праблем па занятасці для іх няма.

За апошнія пяць гадоў прыём у медвучылішчы Мінскай вобласці быў зменшаны больш чым удвая: калі ў 2001 годзе набор складаў 600 чалавек, то летась — ужо 245. Узнікаюць пытанні іншага плана. Як вядома, у 2005 годзе не праводзіўся набор па спецыяльнасці «лячэбная справа». Адпаведна, прагназуецца, што ўжо налета ўзнікне дэфіцыт фельчараў і акушэрак. Такія спецыялісты запатрабаваныя для работы на станцыях хуткай дапамогі, ФАПах, здраўпунктах прамысловых прадпрыемстваў, радзільных дамах, школах і г.д. Таму абласное ўпраўленне звярнулася ў Міністэрства аховы здароўя з просьбай перагледзець кантрольныя лічбы прыёму ў медыцынскія вучылішчы.

— На фінансаванне аховы здароўя выдзяляюцца значныя сродкі — 20—23 працэнты абласнога бюджэту, — адзначае **першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Леанід КРУПЕЦ**. — Гэтыя грошы павінны выкарыстоўвацца з розумам... Увесь комплекс медыцынскіх паслуг павінен быць даступны кожнаму.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Мінск—Барысаў—Мінск.

Толькі лічбы

- Паводле папярэдніх даных, колькасць насельніцтва Беларусі на 1 верасня гэтага года склала **9 млн 714,2 тыс**. чалавек, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Колькасць насельніцтва рэспублікі скарацілася за мінулы год на 36,3 тыс. чалавек.
- У снежні мінулага года намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў рэспублікі была роўная **Br668 тыс.**, што складае **$312** у эквіваленце. Гэты паказчык павялічыўся ў параўнанні з лістападам 2006 года на Br57 тыс., або на 9,3 працэнта.
- Сярэдні памер назначанай месячнай пенсіі ў студзені гэтага года склаў у Беларусі **Br277,6 тыс.**
- У Беларусі ў 2006 годзе зарэгістравана **78 тыс. 974 шлюбы** і **31 тыс. 814 разводаў**. Для параўнання: у 2005 годзе было 73 тыс. 333 шлюбы і 30 тыс. 531 развод.

БЕЛТА.

Суд ды справа

«Хабарныя» махляры на даверы

Ёсць сярод прайдзісветаў такая прафесія: на хабар спакушаць. І хоць падбухторшчыкі старанна рыхтуюць свае аферы, у выніку зазвычай трапляюць на лаву падсудных. Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні КДБ па Мінску і сталічнай вобласці, нядаўна завяршыліся працэсы над чатырма «хабарнымі» махлярамі.

Трое мінчан, даведаўшыся, што адзін сталічны прадпрымальнік хоча атрымаць участак у раёне Камароўскага рынку, прапанавалі сваю дапамогу ў вырашэнні зямельнага пытання. Прайдзісветы, «узброіўшыся» падробленымі пасведчаннямі афіцэраў КДБ і МУС, доўга пераконвалі бізнэсмена ў сваёй саліднасці і наяўнасці «сувязяў» у органах улады. У рэшце рэшт, падбухторшчыкі выцыганілі ў прадпрымальніка 10 тысяч долараў, якія абяцалі перадаць уплывовым людзям. Але пасля таго як «пасрэднікаў» у момант перадачы хабару затрымалі супрацоўнікі КДБ, высветлілася, што яны не збіраліся ні з кім дзяліцца, і ўвогуле ілжэаафіцэры «хабарнага фронту» ад самага пачатку мелі намер «кінуць» бізнэсмена. Суд Цэнтральнага раёна сталіцы прыгаварыў дваіх аферыстаў да 4 гадоў пазбаўлення волі кожнага з канфіскацыяй маёмасці, іх хаўруснік атрымаў 3 гады зняволення.

Яшчэ адзін «хабарны» махляр таксама спрабаваў злоўжыць даверам сталічнага прадпрымальніка. Жыхар Мінска абяцаў бізнэсмену дамовіцца з чыноўнікамі сталічнай мэрыі, каб тыя далі дазвол на змяненне рэжыму працы бара. На вырашэнне праблемы «пасрэднік» папрасіў 1500 долараў, якія, паводле яго слоў, былі прызначаны менавіта на подкуп чыноўнікаў Мінгарвыканкама. Насамрэч, як высветлілася пасля затрымання падбухторшчыка, ён не меў ні ахвоты, ні магчымасцяў дапамагчы бізнэсмену, а «шалёныя» грошы планаваў патраціць выключна на свае патрэбы. Суд Кастрычніцкага раёна сталіцы прыгаварыў «хабарнага» махляра да 2 гадоў папраўчых работ з утрыманнем 25 працэнтаў заробку ў даход дзяржавы.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«Маскі-шоу» на мехдвары

Супрацоўнікамі міліцыі абясшкоджана злачынная група, на рахунку якой шэраг разбойных нападаў.

У прыватнасці, у кастрычніку 2002 года ў Бабруйску па дапамогу да праваахоўнікаў звярнуўся вартаўнік таварыства з дадатковай адказнасцю «Лель». Мужчына паведаміў, што трое невядомых у масках праніклі на тэрыторыю таварыства, звязалі яго і выкралі грузавы аўтамабіль САЗ, 4 трактарныя скаты, 5 бензапіл і зніклі. Пазней трое невядомых у масках паарудвалі на тэрыторыі мехдвара калгаса «Карытнае», што ў Асіповіцкім раёне: яны звязалі вартаўніка і выкралі два трактары МТЗ-1221. Як установлена, гэтыя напады ўчыніла злачынная група, у склад якой уваходзілі чацвёра крымінальнікаў: усе яны былі раней судзімыя за ўчыненыя злачынствы.

Аляксей ЦІТОЎ.

Жыццём і словам прысягаючы...

Асоба

20 лютага адзначае 85-гадовы юбілей Міхаіл ЦІКОЦКІ — доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пераважная большасць журналістаў нашай краіны прайшлі школу прафесара Міхаіла Яўгенавіча Цікоцкага. Ён быў стваральнікам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання на факультэце журналістыкі БДУ.

Аўтарытэтны вучоны-моваznавец, выдатны педагог, Міхаіл Цікоцкі заўжды вылучаўся і як чалавек, багата адораны ад прыроды. З дзяцінства ён малюе, асабліва любіць акварэлі. Ён і цудоўны музыкант, а ў вайну нават музыку пісаў на вершы свайго сябра-аднапалчаніна (адчуваюцца гены яго бацькі, Яўгена Карлавіча Цікоцкага, — вядомага кампазітара, народнага артыста СССР, аднаго з заснавальнікаў прафесійнай музычнай творчасці ў Беларусі).

...Ён з пакалення, якое так і не адзначыла школьны выпускны баль 22 чэрвеня 1941 года... Да лета 1943-га з маці і сястрой заставаўся ў акупацыі. Партызаны праз Маскву даведаліся, што ў Мінску жыве сям'я кампазітара Цікоцкага. Іх пераправілі спачатку ў атрад у Любанскі раён, на востраў Зыслаў, а потым на самалёце ў Маскву. Адтуль і пайшоў на фронт. Быў паранены... Дайшоў да Кёнігсберга...

Пра франтавы шлях Міхаіла Цікоцкага лепш за самыя прыгожыя словы гавораць два медалі «За адвагу». Гэта самыя дарагія ўзнагароды для ветэрана. Яны даваліся за выключныя баявыя дзеянні...

Пасля вайны, паралельна з вучобай на журфаку БДУ, працаваў у газеце «Савецкі селянін». Потым у «Калгаснай праўдзе». Супрацоўнічаў з «Вожыкам»...

І ўсё ж, што вызначальнае ў гэтым унікальным, шматгранным чалавеку? Мабыць, сапраўдная інтэлігентнасць. Такая рэдкая ў наш час якасць...

23 лютага — невыпадкова менавіта ў Дзень Абаронцаў Айчыны! — на факультэце журналістыкі БДУ пройдзе Міжнародная навуковая канферэнцыя «Жыццём і словам прысягаючы...», прысвечаная 85-годдзю прафесара М. Цікоцкага, у якой возьмуць удзел навукоўцы з розных гарадоў Беларусі, а таксама даследчыкі з многіх замежных універсітэтаў.

Таццяна ПАДАЛЯК.

ЭСТЭТЫКА ТАЙНЫ

Экслібрыс «Звязды»

Малаш Ю. А. Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі — Сокровенное наивных художников Беларуси /Юрий Малаш. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2007 . — 80 с. : іл.



«Наіўнае мастацтва з'яўляецца адной з разнавіднасцяў выяўленчага прымітыву. Вядома, што прымітыў як з'ява мастацтва ўзнікае і развіваецца ў розных сацыяльных умовах і ў сваіх каштоўнасных арыентацыях мае разнастайнае кола прыхільнікаў», — піша ў прадмове да альбома-манаграфіі Юрася Малаша «Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі» кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар Рыгор Шаура. Здаецца, яшчэ зусім нядаўна (на справе — усяго колькі дзесяцігоддзяў таму) стаўленне да эстэтыкі прымітыву было досыць пагардлівым.

Выпуск выдання «Патаемнае наіўных мастакоў Беларусі» стаўся магчымым дзякуючы фінансавай падтрымцы Мінскага аблвыканкама і Заслаўскага гарадскога выканаўчага камітэта . Знаёмства з альбомам-манаграфіяй падштурхоўвае і да наступных разваг: а чаму б не выдаць грунтоўны мастацкі альбом, які б прадстаўляў усю спадчыну Язэпа Драздовіча, Алены Кіш, іншых мастакоў-прымітывістаў? І выканаць гэтую задачу, як паказвае праца Юрася Малаша, магла б усё тая ж рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва». Такі альбом змог бы пазнаёміць свет яшчэ з адным абліччам багатай на таленты краіны Беларусь.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛОРУССКАЯ ВАЛЮТНО-ФОНДОВАЯ БИРЖА»

сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 22 марта 2007 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 48а.

Регистрация участников с 14.30 до 14.55.

Повестка дня:

1. Утверждение отчета о деятельности Общества, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2006 год.
2. Отчет ревизионной комиссии о деятельности Общества за 2006 год.
3. Об использовании прибыли Общества за 2006 год и направлении использования прибыли Общества в 2007 году.
4. Об увеличении уставного фонда и внесении изменений в Устав Общества.
5. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
6. О внесении изменений и дополнений в смету текущих расходов ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» на 2007 год.
7. Избрание председателя общего собрания акционеров, членов наблюдательного совета, ревизионной комиссии.

При себе необходимо иметь документы, удостоверяющие личность и подтверждающие полномочия на участие в собрании.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 8 февраля 2007 г.

С материалами по вопросам повестки дня можно ознакомиться по месту нахождения Общества.

Телефон для справок: 206-34-64.

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

сообщает, что 23 марта 2007 года в 11.00 в актовом зале акционерного общества по адресу: 220123 г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 состоится общее собрание акционеров с повесткой дня:

1. Доклад генерального директора и ревизионной комиссии о проделанной работе за 2006 год и о планах на 2007 год.
2. О выплате дивидендов за 2006 год, утверждение использования чистой прибыли в 2007 году.
3. Избрание членов выборных органов Общества.
4. Утверждение новой редакции Устава предприятия.
5. Об утверждении отдельных решений, принимаемых Советом директоров и ревизионной комиссией.
6. О вознаграждении членов Совета директоров и ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации иметь при себе следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!

Сведения по телефонам: 234-33-83, 234-30-31.

Дирекция ОАО «Белтрубопроводстрой».

ОАО «УНИВЕРСАМ ЗАСЛАВЛЬ»

извещает своих акционеров, что очередное общее собрание акционеров состоится 21 марта 2007 г. в 13.00 в магазине «Универсам Заславль» (2-й этаж) по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 49.

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год и основные направления развития Общества в 2007 году.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества за 2006 год. Рассмотрение заключения ревизионной комиссии Общества, аудиторского заключения по результатам проверки ОАО «Универсам Заславль».
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли за 2006 год.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2007 году и 1-м квартале 2008 г.
6. Избирание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О внесении изменений в Устав и утверждение Устава ОАО «Универсам Заславль» в новой редакции.
9. О приобретении акций на баланс Общества.

Начало регистрации с 12.00. При себе иметь паспорт.

Тел. для справок 226-61-90.

ОАО «АМКОДОР»

220013 Г. МИНСК, УЛ. П. БРОВКИ, 8

ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ очередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 29 марта 2007 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 7, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания проводится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Амкодор» за 2006 год.

2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, счета прибыли и убытков.

3. О распределении прибыли за 2006 год и направлениях использования прибыли в 2007 году.

4. Избрание членов Совета директоров, ревизионной комиссии.

5. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 23 марта 2007 года, в юридическом управлении Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор».

Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»,

24 МАРТА 2007 ГОДА состоится общее собрание акционеров ОАО «Белхим», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34. Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Отчет генерального директора ОАО «Белхим» об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году и основных направлениях развития Общества на 2007 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2006 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2006 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2007 год и 1-й квартал 2008 года.
7. Увеличение Уставного фонда Общества.
8. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
9. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О наделении наблюдательного совета полномочиями, отнесенными в соответствии с Уставом, к компетенции собрания акционеров.
11. Об утверждении Устава ОАО «Белхим» в новой редакции.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34, с 10 марта по 24 марта 2007 года (время работы с 9.00 до 16.30) либо 24 марта 2007 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 24 марта 2007 года, 11.00.

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).

Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»

24 марта 2007 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Рапс», расположенного по адресу: 223014 Минская обл., Минский район , д. Крупица.

Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, д. Крупица, ул. Школьная, д. 6, Крупицкий центр культуры, первый этаж, зал заседаний.

Повестка дня собрания:

1. Отчет о работе наблюдательного совета Общества в 2006 году.
2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году и основных направлениях деятельности Общества на 2007 год.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2006 год. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2007 год и 1-й квартал 2008 года.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
9. Об утверждении новой редакции Устава.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, д. Крупица, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 15 по 23 марта 2007 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 24 марта 2007 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 24 марта 2007 г. в 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2007 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!

Справки по тел. 8(017) 5069380, 8(017) 5069433.

Уважаемые акционеры ОАО «Белдортехника»

23 марта 2007 г. в 15.00 состоится очередное собрание акционеров ОАО «Белдортехника», расположенного по адресу: г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б». Собрание состоится по адресу: г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал.

Повестка дня очередного собрания акционеров ОАО «Белдортехника»

1. Отчет о работе наблюдательного совета в 2006 году.
Докладчик — председатель НС Л.Ф. Пушкина

2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год и перспективах развития Общества на 2007 год.
Докладчик — директор Общества Л.А. Гатальский.

3. О результатах проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.
Докладчик — председатель ревизионной комиссии С.М. Белявский.

4. Утверждение годового баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2006 год.
Докладчик — главный бухгалтер В.Н. Блинова.

5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2006 год.
Докладчик — главный бухгалтер В.Н. Блинова.

6. Утверждение направления использования чистой прибыли на 2007 год и первый квартал 2008 года.
Докладчик — главный бухгалтер В.Н. Блинова.

7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
Докладчик — председатель собрания А.И. Савостин.

8. О внесении изменений в Устав Общества в соответствии с Законом «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «Об акционерных обществах, обществах с ограниченной ответственностью и обществах с дополнительной ответственностью» № 100-З от 10.01.2006 г.
Докладчик — юрисконсульт Н.В. Конюшик.

Ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания и проектами их решения можно 12 марта 2007 г. в рабочие дни (понедельник—пятница) с 14.00 до 16.00 в кабинете 312.

Наблюдательный совет.

Інфарм-укол

ЯГАДЫ І БРОКАЛІ — ДЛЯ МОЦНАГА ІНТЭЛЕКТУ

Дацкія вучоныя ўстанавілі, што ягады і капуста брокалі ўтрымліваюць вялікую колькасць раслінных гармонаў, якія дапамагаюць папярэдзіць хваробу Альцгеймера (зніжэнне інтэлекту).

Жанчыны, якія атрымлівалі хоць бы 1 мг гэтых рэчываў у дзень (90 г ягад або 200 г брокалі) паляпшалі памяць на 40 працэнтаў. Гэта высветлілася падчас даследавання, у якім узялі ўдзел 394 датчанкі. Дарэчы, рызыку развіцця хваробы Альцгеймера могуць павысіць лішнія калорыі. Да такой высновы прыйшлі вучоныя з Універсітэта Вашынгтона. Яны даследавалі стан 16 чалавек, якія ўжывалі высокакаларыйную ежу, і выявілі ў іх арганізме 50-працэнтнае павышэнне колькасці рэчываў, якія правакуюць зніжэнне інтэлекту.

«РАСЛІННАСЦЬ» — ДЛЯ ЗДАРОВАГА СТРАЎНІКА

Вялікая колькасць свежай садавіны і гародніны можа зменшыць рызыку развіцця раку страўніка на 15—30 працэнтаў. Так сцвярджае амерыканскі Цэнтр ракавых даследаванняў.

Выкладайце кожную раніцу на стол што-небудзь з садавіны-гародніны і з'ядайце гэта на працягу дня. Замяніце кубак кавы ці шклянку салодкай газіроўкі на таматны сок хоць бы раз на дзень. Не дазваляйце гародніне і садавіне заўчасна паміраць: захоўвайце іх у халадзільніку або маразільнай камеры. Найперш у абед ужывайце салату. Шмат салаты, і толькі пасля — адбіўную.

АД ЛІШКУ ЦЫНКУ — РАК ПРАСТАТЫ

Даследчыкі Нацыянальнага інстытута ракавых захворванняў (ЗША) праверылі стан здароўя 47 тысяч мужчын, якія атрымлівалі каля 100 мг цынку ў дзень, і высветлілі, што яны ў два разы больш схільныя да раку прастаты, чым тыя, хто цынк не ўжываў.

Усяму трэба ведаць меру, і памятаць, што ўвогуле без цынку — не абысціся. Ён важны для дзялення і аднаўлення клетак, нармальнага функцыянавання нервовай і імуннай сістэм. Неабходны для здароўя вачэй. Вядома, што пры некаторых захворваннях органаў зроку колькасць цынку ў сятчатцы паніжана. Але і яго лішак паскарае працэсы неспрыяльных узроставых змяненняў у вачах. Цынк уздзейнічае як антыаксідант — запавольвае працэсы старэння арганізма. Бярэ ўдзел у больш як 80 абменных працэсах. Спецыялісты звязваюць узнікненне парокаў плода з цынкавым дэфіцытам, таму цяжарным жанчынам варта ўдзяляць належную ўвагу ўжыванню гэтага мікраэлемента.


АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ
«ЗВЯЗДЫ»
АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!

Хай глядзіць уніз?

...«Звязда» правільна пісала: за 36 гадоў работы на асветніцкай ніве чаго толькі ў мяне ні было — і смешнага, і сумнага...

У другім класе, памятаю, вымярэнне плошчы праходзілі. Растлумачыў урок, дзеці з большага зразумелі. Да двух хлапчукоў, адно, «не дайшло». Вырашыў паказаць ім на практыцы. Даў абодвум па вялікай драўлянай лінейцы — мерайце, кажу: адзін плошчу падлогі, другі — столі.

Першы хлопчык скеміў: вымераў хуценька даўжыню класа, потым шырыню... А другі стаіць, галаву задраўшы.

— Чаму ты не мераеш? — пытаюся ў Віці.

— Я, — кажа, — не залезу туды.

— А можа з долу як?.. Ты падумай.

— Не, драбіну трэба.

Клас у смех, падказвае яму:

— Па сценах можна памераць, па падлозе.

Адна дзяўчынка дапамагчы ўзялася... Карацей — справіліся, тэму засвоілі.

А назаўтра падыходзіць да мяне Віцеў бацька. Пытаецца:

— Чым вы там займаліся, што дзяцей прымушалі па сценах лазіць?

Давялося патлумачыць яму. Але ж той, відаць, не шмат зразумеў, бо, адыходзячы, буркнуў, што сыну яго ўверх глядзець не прыйдзецца, лётчыкам не будзе. Так што лепш пад ногі...

Што цікава, Віця пасля школы многа ездзіў па свеце, але шчасця там, як кажуць, не знайшоў, вярнуўся назад. Працуе на ферме, выпівае (мякка кажучы) і таму пад ногі, на зямлю глядзіць досыць часта. Каб бутэльку недзе падняць.

Сцяпан НЕФІДОВІЧ.

в. Любань, Лунінецкі раён.

Мастацтва быць чалавекам

У тыя гады я працаваў у ЦК і апынуўся у кампаніі вядомых дзеячаў культуры. Адзін з іх (Генадзь Цітовіч — народны артыст, кіраўнік сусветна вядомага хору) у мой бок з недаверам пазіраў. Казалі, што не любіць ён партыйных работнікаў...

Пра многае мы тады гаварылі. Дагаварыліся ж — да таго, што не заўсёды ў нас пішуць праўду.

— Так-так, — уступіў у размову і я, — узяць хоць бы геніяльнага і генеральнага авіяканструктара Сухога. БелСЭ паведамляе, што нарадзіўся ён у вёсцы Глыбокае Гомельскага павета, а насамрэч — у горадзе Глыбокае... Ці вось пра Цітовіча... Тая ж энцыклапедыя піша, што ён з сям'і настаўнікаў, а насамрэч — бацька яго святар.

— Адкуль вы ведаеце? — неяк спалохана перапыніў мяне Генадзь Іванавіч.

— Ды, — кажу, — з уласнага жыцця. Бацечка ваш — айцец Янка хрысціў мяне. Ды яшчэ і не проста... Раз нарадзіўся на Рамана з Платонам, Раманам хацелі мяне і назваць. Цётка ўпрасіла, каб Ігарам. Айцец Янка паслухаў... І шчаслівае, між іншым, выйшла імя. Мне заўжды шанцавала, калі не лічыць паўгалодных гадоў маленства. Так што дзякуй яму — добра ахрысціў... А праз чатыры гады ён і бацьку ў лепшы свет праводзіў. Убачыў, якая галеча ў сям'і (мама расказвала) — ні капейкі не ўзяў... Мудры чалавек быў, сумленны, спагадлівы...

Генадзь Іванавіч падышоў да мяне, расчулены, прыабняў за плечы.

І ніколі больш не чужыўся.

Ігар БЯГУН.

г. Мінск.

Як рукой зняло!

Люблю вясну, лета... Асабліва — у вёсцы, бо прыгажосць там проста невыказная. Адно — работы зашмат. Толькі пасадзіў, пасеяў — паліваць пара, прапалваць, прарэджваць, рыхліць...

У той дзень я ўжо нарабілася — памылася, сабрала вячэру, толькі прысела, — гвалт за акном:

— Людцы, ратуйце! Ой!.. Ой!..

Суседка, бачу, енчыць, па двары кругі наразае... Да студні падбегла і ў бочку з вадою боўць... Вылазіць... Мокрая, як курыца і ўсё роўна крычыць.

— Што з табою? — падбегшы, пытаюся.

Толькі галавою круціць і на вочы паказвае...

Потым высветлілася. Знаёмая ёй мазі дала — ногі націраць. А як гэта рабіць, — не сказала. Дык тая сваім адумам — на лаўку села, у жменю лекаў націснула і давай калені расціраць.

А вечар жа, мошкі хмарамі ўюцца. Адагнала. Адна ў вока трапіла. Яна туды рукой (з маззю)...

Боль — проста нясцерпны быў. Ледзь мы з ім саўладалі.

Спрабавалі было той лекарцы прэтэнзіі выставіць. Не прыняла. Сказала:

— Хоць не надоўга, але ж паглядзі, як памагла мая мазь. Хваробы твае, як рукой зняло. Я ж бачыла, як ты па двары гойсала. На хворых нагах гэтак не палётаеш.

Н.І. БРАКАЛА.

г. Гродна.

А дзверы проста адчыняліся...

Не вам казаць — грамадскія туалеты ў нас такія, што вочы б іх не бачылі! Ды прыходзіцца...

І не толькі бачыць... Бо нідзе ж не дзенешся...

А між іншым, парадак там навесці можна. Для гэтага шмат магчымасцяў ёсць. Пра адну — у прыватнасці — мой зямляк расказаў.

Здарылася гэта з ім самім і досыць даўно. Паехаць за мяжу (а тым больш — у нейкую капіталістычную краіну) мог тады не кожны. Яму ж — пашанцавала, бо пры партфелі, як кажуць, быў.

Дык вось. Прыехаў ён, пасяліўся ў гатэлі. Не нумар там — каралеўскі пакой: дываны, дыхтоўная мэбля, пяшчотныя шторы на вокнах. А ўжо туалет... Зайшоў, плітку на сценах пагладзіў, падзівіўся, колькі люстэркаў там, колькі наваротаў нейкіх кшталту папяровых ручнікоў, вадкага мыла... Ну і патрэбу справіў. Чын чынаром усё.

А сабраўся выйсці — не можа: дзверы зачынены. Ён ля іх і так, і гэтак — і тузаў, і спражкай ад дзягі падважваў, і плечуком націскаў... Нічога. Грукаў доўга — ніхто не пачуў. Клікаў на дапамогу — марна... З адчаю — зароў на ўвесь голас, сказаў усё, што ён думае (пра гэту краіну — таксама).

...Праз некалькі гадзін, калі сіл ніякіх ужо не было, пакаёўка ў нумар зайшла. Азвалася, адчыніла яго. Ён (мовы ж не ведаў) давай на пальцах паказваць ёй, які бардак тут, як дзверы «заела»...

Жанчына ж, на здзіў, вельмі хутка ўсё зразумела. Падышла да ўнітаза, націснула кнопку, — дзверы аўтаматычна адчыніліся. Для гэтага ўсяго і трэба было, што змыць за сабой.

Няхітрая навука і нармальнаму чалавеку яна без патрэбы, але ж тых, хто прывык хадзіць у «шпакоўню» вучыць неяк трэба...

Наталля ШТЭЙНЕР.

г. Валожын.

На Газу!

Астравецкі раён адметны апроч іншага тым, што ёсць тут свае Малі (толькі з націскам на першым складзе), ёсць Палестына, Філіпаны, Чэхі, ёсць і свая Газа (не блытаць з сектарам, бо націск на апошнім складзе)...

Дык вось. Адна настаўніца туды на працу ездзіць — «аўтастопам». Цэлая навука, расказвала — перад кім галасаваць, а перад кім не, як сябе весці, каб быць у бяспецы, як грошы за праезд зэканоміць. Але ж, як высветлілася, нават з гэткім вопытам, можна «ўляцець».

У той дзень яна яўна спазнялася, але шанцы паспець яшчэ заставаліся: ледзь не адразу машыну спыніла (з літоўскімі нумарамі), спытала:

— Вы на Газу́?

Вадзіцель неяк здзіўлена паглядзеў на яе, але галавою кіўнуў. Жанчына села. Паехалі. Пагаварылі пра тое-другое (гэта, яна казала, абавязковая ўмова...). На скрыжаванні ён у вёску звярнуў... Спадарожніца захвалявалася:

— Дык вы на Газу́ едзеце?

— Так. Я ж вам казаў, — раздражнёна буркнуў вадзіцель і змоўк.

Настаўніца — таксама: ці мала куды трэба чалавеку заехаць. Галоўнае — на работу паспець.

Вёску мінулі. Едуць... Яўна не туды. Жанчына ў лямант:

— Стойце... Ды куды вы мяне везяце?

— Як куды? У Астравец.

— Дык я ж у вас сто разоў пытала, ці вы на Газу́?!

— А я вам і казаў, што на газу́... Гэта танней, чым на бензіне... Толькі вам што да таго, на чым мой рухавік працуе?

— Госпадзі! — ледзь не расплакалася спадарожніца, — якая мне справа да вашай машыны! Мне ў Газу́ трэба. Гэта вёска такая на Полацкім тракце...

У якасці маральнай кампенсацыі той вадзіцель да работы жанчыну «падкінуў». А яна цяпер, калі спыняе спадарожную машыну, заўсёды пытаецца:

— Вы прама едзеце ці на Астравец паварочваеце?

Ніна РЫБІК.

г. Астравец.

Камплімент

Відаць, кожнаму, хто ўжо трохі пажыў, прывялося хварэць і ляжаць у бальніцы. Таму — не цяжка будзе ўявіць...

Палата, значыць. Позні вечар. Хворыя спаць паляглі. Асобныя — ужо і паснулі. Дзвюм кабетам не спіцца — ціхенька, каб іншых не будзіць, адна пытае:

— Маня, а як там Вольга жыве?

— Ды нічога, кумачка, тупае паціху, у градах грабецца.

— А Іванаўна як?

— О-о, Іванаўна... Ты яе не пазнаеш цяпер. Так раздалася, так растаўсцела...

— Няўжо? Была ж худая, як жэрдка.

— Дык то — была... А цяпер... Разрабілася, як тая карова... Як ты, кумачка.

— Што ты гаворыш?!

— Праўду! Праўдачку! Такая карова, як ты... Далібог!

...Усе жанчыны (якія і спалі ўжо!) узарваліся гучным рогатам. Добры ж камплімент, праўда?

А.Э. ЯКУБОВІЧ.

в. Струбніца, Мастоўскі раён.

Дружба — даражэй

Казюк ужо стары чалавек. Жонку пахаваў, дзеці з'ехалі... Адзін жыве. Але не адзінокі, бо паважаюць яго. Залатыя рукі некалі меў — рабіў куфры, шафы, сталы, табурэткі.

Зараз — не тое. Нават кароўку прадаў. А свінчо сёлета карміў. І выкарміў — папрасіў суседа, каб закалоць прыйшоў. Той паслухаўся, усё зрабіў, як след, забраў аплату (натурай); суседкі сала пасалілі, пераклалі часначком, каўбас «накруцілі»...

Дык вось. Падсушыў гаспадар гэтую смакату на шосціку перад печчу, злажыў у спецыяльны плецены кошык з накрыўкай, глядзіць — завязкі няма. Пахадзіў па хаце. Знайшоў матузок. Завязаў свой скарб, вынес у кладоўку. Усё, маўляў, спарадкаваў кабанчыка.

Адзінай істотай жывой цяпер кот заставаўся — добры сябрук. Скардзіліся яны адзін аднаму на свае бядоты, спалі ў адным ложку...

У той вечар, аднак, Васька дамоў не прыйшоў. Лёг гаспадар — не спіцца. Раніцай устаў — пагаварыць няма з кім...

Шукаў ката па ўсіх буданах, у суседзяў пытаў — як скрозь зямлю праваліўся. Сумна стала — да слёз: месца дзед сабе не знаходзіць... Рашыў паглядзець, як каўбасы ляжаць. Прынёс кош у хату, адкрыў века... Кот як дасць пад рукі. І адразу да вады — п'е, аж вушы злажыў.

— Во дзе ты быў, нягоднік, — узрадаваўся гаспадар.

Васька вінавата аблізнуўся і потым, відаць, просячы прабачэння, стаў выпісваць васьмёркі ў дзеда ля ног.

— Ну, годзе, годзе прасіцца. Не злую... Дружба ж — яна, брат, даражэй за каўбасы. Добра, што жывы застаўся, а мог бы і загінуць. Ад смагі...

Іван БЯЛЯЎСКІ.

в. Вішнева, Смаргонскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.20	17.28	10.08
Віцебск —	7.12	17.15	10.03
Магілёў —	7.10	17.18	10.08
Гомель —	7.03	17.18	10.15
Гродна —	7.34	17.44	10.10
Брэст —	7.32	17.48	10.16

Месяц

Апошняя квадра 10 лютага
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Герасіма, Івана, Ігната, Канстанціна, Селівана, Якава;*
К. *Бажэны, Бернардэты, Брыгіты, Марыі, Альгерда, Рыгора.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	-1 — +1 °C	Без ападкаў	
ВІЛЬНЮС	-17 — -15 °C	Без ападкаў	
КІЕЎ	-9 — -7 °C	Без ападкаў	
МАСКВА	-17 — -15 °C	Без ападкаў	
РЫГА	-14 — -12 °C	Без ападкаў	
С-ПЕЦЯРБУРГ	-12 — 10 °C		

20 лютага

Дзве даты

1872 год — у Злучаных Штатах запатэнтаваны электрычны ліфт, прыстасаванне, без якога не абыходзяцца сёння жыхары гарадскіх шматпавярховак.

1903 год — у сяле Хоціна Віцебскай губерні нарадзіўся Леў Міхайлавіч Даватар, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. Камандаваў Асобай кавалерыйскай групай, якая ў жніўні—кастрычніку 1941 года рабіла рэйды па тылах праціўніка. Загінуў у баі.

Цытата дня:

«З мудрасці выцякаюць тры наступныя асаблівасці: прымаць выдатныя рашэнні, беспамылкова гаварыць і рабіць тое, што варта».

Дэмакрыт (460—370 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

УСМІХНЁМСЯ!

Калі дакладна ведаеш, хто вінаваты — не выдавай сябе.

☺

— Ты што там з газеты выразаеш?

— Заметку пра мужчыну, які запатрабаваў развод з-за таго, што жонка лазіць па яго кішэнях.

— І навошта яна табе?

— Палажу ў кішэню.

☺

Аб'ява ў інстытуце: «Экзамен не адбудзецца. Усе білеты прададзеныя».

У суд Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Ясько Мікалая Іосіфавіча,** 15 жніўня 1971 года нараджэння, ураджэнца в. Палонь Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, апошняе месца жыхарства в. Падгорная Сімоха, вул. Леніна, д. 2, кв. 4 Атрадзенскага раёна Краснадарскага края Расійскай Федэрацыі.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра М.І. Ясько, паведаміць іх суду Ганцавіцкага раёна на адрас: 225432, г. Ганцавічы, вул. Камуністычная, д. 21 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Згублены **студэнцкі білет № А0003206**, выдадзены на імя **Цітавец Вольгі Валер'еўны,** лічыць **несапраўдным**.

Чорны бусел зазімаваў на аўтамыйцы ў Рэчыцы

Чорны бусел, які зламаў крыло ў Рэчыцкім раёне, быў бы асуджаны на гібель, калі б не ўладальнік аўтамабільнай мыйкі рэчыцкага прадпрыемства «Дыялог-Сэрвіс» Аляксандр Сенін. Ён не толькі даставіў даволі рэдкую птушку ў Рэчыцу, але і абследаваў у ветэрынара, а потым прама на аўтамабільнай мыйцы наладзіў для бусла зімоўку. Назіральная пляцоўка памерам каля 10 квадратных метраў пасля зашклення стала цудоўнай верандай для чорнага бусла, які зверху з задавальненнем «кантралюе» мыццё аўтамабіляў. Дзеці і супрацоўнікі рэчыцкай станцыі юных натуралістаў прыносяць для бусла, якога ўжо паспелі ахрысціць Чарнышом, вітаміны, а рыбай і іншымі прадуктамі бусла забяспечвае Аляксандр Сенін і супрацоўнікі аўтамабільнай мыйкі. У планах Аляксандра Сеніна знайсці да вясны пару для птушкі, а потым ужо будзе разглядацца пытанне аб вяртанні яго ў натуральныя ўмовы.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

Віншуем любую бабулю, маці і жонку ***Дануту Альфонсаўну МІХНО*** *з днём нараджэння. Жадаем шчасця і здароўя і каб на ўсё хапала сіл.*

Родныя, *в. Церабейнае.*

Дарагога сына ***Сяргея Васільевіча ШЧЭРБАЧЭНЮ*** *віншуем з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, сямейнага шчасця і дабрабыту.*

Бацькі, *в. Шчыткавічы.*

Сардэчна віншую ***Ларысу Станіславаўну ЮРЛЕВІЧ*** *з юбілеем. Жадаю моцнага здароўя, дабрабыту, многіх гадоў шчаслівага жыцця і поспехаў у працы.*

Лідзія Іосіфаўна, *г. Ляхавічы.*

ПаWWWуцінне ад Вікторыі ЗАХАРАВАЙ

Дзве навіны Байнэта

Манапаліст па выдачы даменных імёнаў у зоне .BY, кампанія «Адкрыты кантакт» абвясціла аб зніжэнні цаны на рэгістрацыю дамена. Калі раней завесці «імя» з канчаткам на .by уладальнікам уласнага або карпаратыўнага сайта каштавала Br190 тысяч, то зараз — 130. Праўда, за падаўжэнне рэгістрацыі давядзецца штогод выкладваць яшчэ па 95 тысяч рублёў. Як мяркуецца, калі манаполія рэгістратара будзе парушана і на гэтым рынку з'явяцца яшчэ некалькі кампаній, цана на дамены .by знізіцца яшчэ больш. Гэтай, безумоўна, добрай навіне, відаць, асабліва парадуюцца ўладальнікі айчынных Інтэрнэт-магазінаў — зусім хутка ўступіць у сілу прадпісанне Савета Міністраў, паводле якіх віртуальны гандаль павінен весціся выключна ў межах беларускага сектара Інтэрнэт.

А вось яшчэ адна пастанова Саўміна — Палажэнне аб парадку работы камп'ютарных клубаў і Інтэрнэт-кафэ — наўрад ці станоўча ўзрушыць гаспадароў гэтых самых Інтэрнэт-клубаў. Правілы працы ўстаноў, што ажыццяўляюць публічны доступ да Інтэрнэта, будуць больш жорсткімі. У прыватнасці, уладальнікам клубаў неабходна будзе весці электронны журнал (улік) імёнаў сайтаў, на якія заходзілі наведвальнікі. Захоўваць спасылкі ў гэтым журнале трэба не менш як 1 год, а ў выпадку неабходнасці давядзецца прадстаўляць гэту інфармацыю праваахоўным органам і іншым органам дзяржкантролю. Самім жа наведвальнікам камп'ютарных клубаў і Інтэрнэт-кафэ забараняецца выкарыстоўваць праграмы, якія Рэспубліканская экспертная камісія па прадухіленню прапаганды парнаграфіі, насілля і жорсткасці прызнала гэтай самай прапагандай. Наступствы гэтай меры пралічыць няцяжка — скарачэнне колькасці наведвальнікаў і, адпаведна, прыбыткаў беларускіх Інтэрнэт-кафэ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАБ МАРОЗ НЕ ШЧЫПАЎ ЗА НОС

Зіма. Са снегам, сцюдзёнымі вятрамі і траскучымі маразамі. Мы хутаемся ў цёплае адзенне і футра. І толькі наш непрыкрыты твар знаходзіцца пад уздзеяннем усіх капрызаў надвор'я. Праблема «нумар адзін» — перапады тэмпературы, якія могуць дасягаць 30 градусаў. Дом—вуліца—метро—вуліца—работа — нашай скуры прыходзіцца нялёгка. Парушаецца кровазварот, запавольваецца працэс абнаўлення клетак, пагаршаецца жыўленне скуры, зніжаюцца яе ахоўныя функцыі. Ад рэзкага чаргавання звужэння і расшырэння сасудаў у адных скура твару чырванее або пакрываецца дробнай «сетачкай», у другіх — становіцца сухой і вялай. Памылкай было б лічыць, што толькі летам існуе небяспека абязводжвання скуры. Зімой яе сушаць мароз, вецер, кандыцыянеры і ацяпляльныя батарэі. Зіма для скуры — самы небяспечны перыяд яшчэ і таму, што менавіта гэта пара года збірае ўсе непрыемнасці іншых сезонаў: авітаміноз і каварныя сонечныя промні. Як жа падрыхтаваць скуру да зімовага выпрабавання? Якім касметычным сродкам аддаць перавагу?

Па-першае, трэба мець на ўвазе, што тып вашай скуры зімой можа змяніцца, а значыць, павінны змяніцца і сродкі догляду. Калі летам у вас, напрыклад, тлустая скура, то ў зімовы перыяд яе цалкам можна аднесці да нармальнай. А нармальны тып скуры можа ператварыцца ў сухі, а сухі становіцца звышадчувальным. Увогуле, лічаць касметолагі, **зімой скуру лепш даглядаць як нешта далікатнае і пяшчотнае**. І калі ў цёплы час года варта кіравацца схемай «ачышчэнне—увільгатненне—засцярога», то ў маразы яе трэба змяніць на **«ачышчэнне—жыўленне—засцярога».**

Такім чынам — **ачышчэнне**. Зімой яно патрэбнае не менш, чым летам. Касметолагі раяць выбіраць на зіму больш мяккія ачышчальныя сродкі, такія, як вяршкі або малачко, у састаў якіх уваходзяць вітаміны, экстракты траў, што знімаюць раздражненне, раслінны алей. Таксама неабходна адмовіцца ад спіртазмяшчальных ласьёнаў і выкарыстоўваць безалкагольныя тонікі.

Калі ж вы не можаце абысціся без традыцыйных сродкаў для ўмывання — спецыяльных геляў і пенак, то звярніце ўвагу на найбольш ашчадлівыя па свайму саставу. Ваду варта выкарыстоўваць гатаваную, а яшчэ лепш — умывацца травянымі адварамі. Дарэчы, калі вы ўсё ж вырашылі ўмывацца раніцай менавіта вадой, рабіце гэта не пазней чым за паўтары гадзіны да выхаду.

Цяпер — **пра жыўленне і засцярогу.** На думку касметолагаў, лепш набываць айчынныя касметычныя сродкі або сродкі, выробленыя ў краінах з падобным кліматам, бо распрацоўшчыкі імпартных крэмаў не заўсёды ўлічваюць моцнасць маразоў і перапады тэмператур, уласцівыя для нашых шыротаў.

У халодны час года функцыю «адзення» для скуры твару выконваюць «зімнія» крэмы. Як правіла, яны больш густыя і тлустыя. Тлусты (або паўтлусты) дзённы крэм трэба наносіць на скуру хвілін за 40 да выхаду з дому. Асабліва карысныя крэмы, якія змяшчаюць вітаміны А, Е і С, а таксама ланалін, гліцэрыну, ліпіды. Пажадана, каб у састаў касметычнага сродку ўваходзілі рэчывы, якія паляпшаюць рэгенерацыю і абменныя працэсы клетак — фруктовыя кіслоты, алей жажаба, міндальны або кедравы алей.

Зімой часцей трэба праводзіць дадатковыя працэдуры па жыўленню і ўвільгатненню — прымяняць **маскі**. І лепш — у вячэрні час. Эфект ад маскі ўзмацняецца, калі папярэдне зрабіць кампрэс з чаю, соку, малака, травянога адвару. Пры сухой скуры не варта карыстацца маскамі, якія сцягваюць скуру, а лепш аддаць перавагу тлустым і насычаным — з **экстрактам парасткаў пшаніцы, соі, алеем міндаля, персіка.** Маскі для тлустай скуры павінны быць мяккай, эмульсійнай або гелевай кансістэнцыі, змяшчаць **экстракт бярозавых пупышак, лаванды, алей размарыну, хвойны экстракт, пропаліс** і інш. Агульным правілам з'яўляецца абавязковае праціранне скуры тонікам пасля змывання маскі.

Два разы на тыдзень рэкамендуецца глыбокая ачыстка — адлушчванне. Пры гэтым трэба выкарыстоўваць неагрэсіўныя, лёгкія сродкі (гамаж, мяккія пілінгі), каб лішні раз не траўміраваць скуру і не перасушыць яе.

Асобна варта сказаць пра адчувальную скуру. Зімой яна вельмі пакутуе ад перападаў тэмпературы і вільготнасці. Скура становіцца раздражнёнай, лушчыцца, любое дакрананне прыносіць дыскамфорт. Такой скуры неабходна даваць адпачынак пад заспакаяльнай маскай штодзень. Пасля зняцця макіяжу пакладзіце на твар сурвэтку, змочаную ў цёплым, крыху вышэй тэмпературы цела настоі рамонку, і патрымайце яе да таго моманту, пакуль яна не астыне, а пасля можна пачынаць звычайны догляд.

Для зімовага догляду павек прадугледжаны тлустыя, інтэнсіўныя крэмы, маскі і сывараткі. Вельмі добра падыходзяць у гэты перыяд біяактыўныя патчы пад вочы — пласцінкі, якія насычаны спецыяльнымі пажыўнымі рэчывамі і спалучаюць уласцівасці маскі і сывараткі. Яны накладваюцца на 15—20 хвілін на скуру павек, пасля чаго наносіцца звычайны крэм.

Асаблівай увагі зімой патрабуюць і вусны. Карысна мець гігіенічную губную памаду. У засцерагальных мэтах не рэкамендуецца карыстацца ўвільгатняльнымі памадамі, бо яны садзейнічаюць абветрыванню. На ноч варта наносіць пажыўны бальзам для вуснаў, тлусты крэм або аліўкавы алей.

Ну вось, цяпер і зімой наш твар будзе выглядаць выдатна!

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Майстар-класы для цырульнікаў

Зусім нядаўна беларуская каманда цырульнікаў вярнулася з 10-га чэмпіянату Масквы па цырульніцкаму майстэрству, дэкаратыўнай касметыкі і манікюру з прызавымі месцамі.

Днямі дзесяць лепшых майстроў правялі навучальны семінар для цырульнікаў Мінска. Анатоль Лазараў, які заняў на чэмпіянаце першае месца ў класічнай мужчынскай прычосцы, падзяліўся сакрэтамі свайго майстэрства, паказаў тыповыя памылкі маладых цырульнікаў. Вельмі складаную прычоску рабіла Вольга Яновіч, якая «ўзяла» на чэмпіянаце гран-пры ў намінацыі «Дзіцячая прычоска». Дарэчы, лепшыя мінскія цырульнікі набіраюцца вопыту і рыхтуюцца да конкурсу «Лепшы майстар года», які плануецца правесці ў сярэдзіне сакавіка.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 985. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12